# Праекты разьмеркаваньня даходаў—на абгаварэньне калгасных мас

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мск. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 268 (4174)
Пятніца 2 кастрычніка
1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

## ВЫКІРЫЦЬ МАНЗУРЫ АГЕНТУРЫ КУЛАКА. У некаторых калгасах Койданаўскага раёну дзелять бульбу на корані і па падворным прынцыпе. Апартуністы з Мсьціслаўскай МТС імкнуцца зьменьшыць адлічэньні ў непадзельныя фонды

### МАЦНЕЙ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТАХ—АПАРТУНІСТАХ. ЗРУИНАВАЦЬ УРАЎНІЛАЎКУ

### *Неадкладна давесьці пастанову НКЗ і Калгасцэнтру аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў да кожнага калгасу*

## Дабіцца пералому ў перабудове грамадзкага харчаваньня

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб мерапрыемствах па паляпшэньні становішча грамадзкага харчаваньня ў разгорнутай форме выпачае канкрэтныя шляхі перабудовы гэтай адказнай галіны работы.

У сьвятле агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва паказаная пастанова ЦК і СНК мае вялікае значэньне.

Далейшае павышэньне тэмпаў індустрыялізацыі, пасьпяховае выкананьне прамфінпляну, барацьба з цяжкасьцю рабочай сілы знаходзяцца ў непасрэднай сувязі з паляпшэньнем матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы. Грамадзкае харчаваньне зьяўляецца якраз адным з важнейшых элемэнтаў у сыстэме мерапрыемстваў гэтага парадку.

Аднак, той факт, што «рад пастаноў ЦК аб грамадзкім харчаваньні выконваецца дрэнна», з усёй сілай падкрэсьлівае наяўнасьць недаацэнкі гэтай галіны работы. Да сёньняшняга дня няма пералому ў паляпшэньні грамадзкага харчаваньня і асабліва ў яго якасьці.

Безгаспадарчасьць, абязьлічка ў кіраўніцтве, няўменьне выкарыстаць мясцовыя рэсурсы, нагадлівыя адносіны да гатаваньня стравы лічацца «нармальнымі» зьявішчамі ў цэлым радзе нашых сталовак.

Якасьць работы сталовак у вялікай меры залежыць ад таго, наколькі органы снабжэньня правільна арганізуюць сваю работу. У наяўнасьці неадзіночныя факты, калі гародніна і іншыя прадукты спажываньня доўгі час ляжаць на базах, у мясцох нагрузак і ў папсаваным выглядзе нападаюць у сталоўкі.

Справа грамадзкага харчаваньня ў рабоце раду партыйных, прафсаюзных і каапэрацыйных арганізацый не пастаўлена, як баявая палітычная задача.

І да сёньняшняга дня асобныя гора-работнікі ў ажыраўданьне сваёй бязьдзейнасьці прабуюць «спасылацца на тое, што раней снабжэньне рабочых было значна горшае, чым зараз, і што можна, з прычыны гэтага, быць задаволеным існуючым становішчам. Толькі гнілыя, наскрозь пратухлыя людзі могуць захапляцца спасылканьнем на мінулае. Трэба выходзіць ня з мінулага, а з узрастаючых патрэбнасьцяй рабочых у даны момант. Трэба зразумець, што ўмовы існаваньня рабочых у нас зьмяніліся ў корані» (Сталін).

Пад знакам рэалізацыі гэтага важнейшага ўказаньня правадыра партыі павінна быць зараз разгорнута баявая работа па перабудове справы грамадзкага харчаваньня.

Цэнтральнае месца ў гэтай рабоце павінна быць аддана справе забесьпячэньня прадуктамі і ўпарадкаваньня загатовак для патрэб грамадзкага харчаваньня.

ЦК КП(б)Б і СНК прапанавалі Белкаапсаюзу і Наркамснабу вылучыць, апрача цэнтралізаванага, мясцовыя фонды для паляпшэньня грамадзкага харчаваньня. Разам з тым дана права асобным сталоўкам самастойна заключаць умовы з загатоўчымі арганізацыямі.

Гэтыя мерапрыемствы павінны быць неадкладна ажыцьцёўлены.

Разгортваньне мясцовай ініцыятывы, арганізацыя сьвінаадкормачных і птушніцкіх пунктаў з выкарыстаньнем іх прадукцыі выключна для патрэб сталоўкі ў злучэньні з добра наладжаным цэнтралізаваным забесьпячэньнем зьявяцца магутным сродкам паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

У мэтах найбольш поўнага ахопу грамадзкім харчаваньнем рабочых і іх сем'яў неабходна разгарнуць работу па арганізацыі новых устаноў грамадзкага харчаваньня і ўпершую чаргу самадзейных сталовак, сталовак каапэрацыйнага тыпу і буфетаў.

Разам з тым зараз выключную ўвагу трэба аддаць справе кіраўніцтва і арганізацыі работы саміх сталовак.

Па-першае, неабходна дабіцца таго, каб кожны загадчык сталоўкі быў у поўнай меры адзінаначальнікам і цалкам адказваў за становішча работы сталовай.

Па-другое, патрэбна дабіць абязьлічку, скончыць пераход усіх сталовак на зьдзельшчыну, ліквідаваць стратнасьць, дасягнуўшы поўнай іх рэнтабэльнасьці, устанавіць бракераж прадуктаў.

Далейшае разгортваньне сеткі грамадзкага харчаваньня ва многім упіраецца ў слабасьць матар'яльна-тэхнічнай базы. Між тым цэлы рад гаспадарчых арганізацый замест узмацненьня гэтай базы недапушчальна адносяцца да такой справы, як будаўніцтва і рамонт памяшканьняў пад сталоўкі.

ЦК КП(б)Б і СНК прапанавана «Белкаапсаюзу і яго сэкцыям неадкладна прыступіць да правядзеньня рамонту з разлікам скончэньня яго не пазьней 1-га сьнежня», а будаўніцтва новых сталовак прыраўнена да па-зачарговага, ударнага.

Пастанова ЦК і СНК аб грамадзкім харчаваньні зьяўляецца баявой праграмай работы па паляпшэньні матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы.

Задача партыйных, прафсыянальных, каапэрацыйных і ўсіх грамадзкіх арганізацый—ператварыць гэту праграму ў жыцьцё.

Неабходна ва ўсю шырыню разгарнуць растлумачальную работу вакол задач карэннай перабудовы грамадзкага харчаваньня, устанавіць сапраўдны кантроль рабочых мас.

Рэалізацыю пастановы ЦК патрэбна зрабіць непасрэднай справай кожнай партыйнай ячэйкі, гаспадарнікаў, прафсаюзнай арганізацыі, кожнага работніка.

## Неадкладна выправіць дапушчаныя скажэньні дырэктыў партыі і ураду

Ня гледзячы на рад дырэктыў аб разьмеркаваньні ўраджаю выключна па колькасьці і якасьці працы кожнага калгасьніка, усё-ж і на сёньняшні дзень ёсьць у пасобных калгасах самыя грубыя парушэньні гэтага прынцыпу.

З допісу селькора Гаеўскага (Койданаўскі раён) бачым, як у калгасе «Гай Беларусі» падзялілі бульбу па кулацкім прынцыпе—па 0,25 гэкт. на кожны двор. Такая падворная і падушная дзяльба наглядаецца і ў калгасах Магілёўшчыны—«Чырвоны басц», «1-га мая», «Шлях працы» і г. д.

Як відаць арганізацыі гэтых раёнаў ня ўлічылі памылак, якія былі дапушчаны пры разьмеркаваньні сена ў асобных мясцох. Сена там дзялілі па колькасьці кароў, у выніку—у родзе мясц абагуленае стада не забясьпечана кармамі. Цяпер дзе-ні-дзе пачынаюць дзяліць бульбу па падворным прынцыпе, у той час, як яна яшчэ стаіць на корані. Гэтыя факты наглядна паказваюць, як кулацкія агенты дапамагаюць клясаваму ворагу падрываць эканамічную моц калгасаў.

Мы патрабуем ад памяненых раённых арганізацый хутка выправіць дапушчаныя скажэньні дырэктыў партыі, а кулацкіх агентаў, якія праводзяць ядоцкія прынцыпы—прыцягнуць да адказнасьці. Неабходна ўстанавіць штодзённае кіраўніцтва кампаніяй і гатым самым дабіцца, каб разьмеркаваньне бульбы і іншых прадуктаў, рабілася выключна на па працаднёх. Калгасцэнтр павінен прыцягнуць да самай суровай адказнасьці тыя раённыя калгасныя арганізацыі, якія дапусьцілі і дапускаюць кулацкую ўраўнілаўку.

Нельга прайсьці міма паведамленьня са Мсьціслаўскага раёну, дзе разьмеркаваньне робіцца за сьпіною калгаснай масы, дзе апартуністы імкнуцца зьменшыць адлічэньні ў непадзельныя капіталы.

Кулацкая ўраўнілаўка якраз пануе там, дзе шырокія колы калгасьнікаў ігнаруюцца, дзе калгасьнікі-ўдарнікі ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў абгаварэньні папярэдняга праекту разьмеркаваньня прыбыткаў, дзе пастанова Калгасцэнтру і НКЗ аб разьмеркаваньні даходаў не даведзена да мас.

Раённыя арганізацыі павінны сваю работу праводзіць так, каб праект разьмеркаваньня ўраджаю быў раней грунтоўна абгаворан на сходзе калгасьнікаў. Кожны калгасьнік павінен ведаць асноўныя прынцыпы разьмеркаваньня прыбыткаў.

Толькі пры такіх умовах мы здолеем зьнішчыць дробна-буржуазную ўраўнілаўку і разьмеркаваць як бульбу, так і іншыя даходы, па колькасьці і якасьці працы і гэтым самым нанесьці яшчэ адзін руйнуючы ўдар па клясавым ворагу і яго агентах—апартуністах.

## Пастанова аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю не распрацавана

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру аб прыкладным разьмеркаваньні ўраджаю ў большасьці калгасаў раёну не распрацавана. Калгасьнікі калгасу «Чырвоны баец» і «1-га мая» да гэтага часу ня ведаюць аб прынцыпах разьмеркаваньня. Праўленьні гэтых калгасаў, якія складаюцца ў большасьці з заможнікаў, разьмяркоўваюць прадукты і грубыя карма па адзках, гаспадарках і колькасьці кароў. У калгасе «Шлях працы» садавіну і гародніну разьмеркавалі выключна па душах. Калгасьнікі, якія добрасумленна працавалі, атрымалі столькі-ж, колькі атрымалі і гультаі. У калгасе імя Варашылова авансы выдаюцца па колькасьці рабочых дзён, а не па колькасьці і якасьці працы—працаднёх.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што раённыя арганізацыі не вядуць рашучай барацьбы з дробна-буржуазнай ураўнілаўкай, не паставілі работы па разьмеркаваньні ўраджаю ў цэнтр сваёй увагі.

Ул. Мэрскі.

## Праўленьні калгасу пазбаўляюць адыходнікаў прадуктаў

Будаўніцтва сьвінарнікаў у саўгасе ХАЛОПЕНІЧЫ (Крупскі раён), праходзіць марудлівымі тэмпамі. Галоўная прычына—недахват рабочай сілы. Адміністрацыя саўгасу не паклапацілася аб арганізаваным наборы рабочай сілы шляхам заключэньня ўмоў з калгасамі і адзінаасобнікамі. Заключана толькі адна ўмова з калгасам.

Саломай саўгас не забясьпечан, агодна парады яго панны забясьпечыць Халопеніцкі і Гарадзецкі сельсаветы, але старшыні гэтых сельсаветаў не прынялі ніякіх мер для забесьпячэньня саўгасу саломай.

Культурнасавая праца сярод рабочых-будаўнікоў і калгасьнікаў не разгорнута. Калгасьнікі ня ведаюць аб льготах, якімі карыстаюцца адыходнікі. Некаторыя праўленьні калгасаў адыходнікаў ня лічаць калгасьнікамі, пры разьмеркаваньні прадуктаў і дэфіцытных тавараў адыходнікі і іх сем'і ня улічваюцца. (Калгасы «Чырвоны копас», «Баркоўскі»). Сельпаркомы і райкалгасаюзы не рэагуюць на такія ганебныя зьявішчы з боку праўленьняў калгасаў.

Г. С.

## У Мсьціслаўлі імкнуцца праесьці непадзельныя фонды

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Ад нашага спэцкора). У калгасах «Чырвоны дзень» і «Пралетарская перамога» да гэтага часу калгасьнікі ня ведаюць прынцыпу разьмеркаваньня ўраджаю, бо пастанова НКЗ і Белкалгасцэнтру тут не распрацавана.

Наглядаецца масавая тэндэнцыя правесьці папярэдняе разьмеркаваньне даходаў канцылярскім парадкам. Разьмеркаваньне робіць аграном МТС і рахункавод калгасу, а ўся калгасная маса застаецца ў баку. Па іх думцы трэба толькі скласьці справаздачу, зайвердзіць на сходзе... і кропка.

Недавацэнку ўдзелу мас калгасьнікаў у такой вялізарнай гаспадарча-палітычнай кампаніі, як разьмеркаваньне даходаў, нельга інакш разглядаць, як палітычную блізарукасьць мясцовых работнікаў.

Старэйшы аграном МТС лічыць, што за лік памяншэньня непадзельных фондаў неабходна кампенсаваць нізкую выпрацоўку калгасьнікаў, якая атрымалася таму, што на працягу ўсяго году была слабая працоўная дысцыпліна, дзякуючы чаму зьмяншаўся ўраджай.

Па намерах апартуністаў, якія імкнуцца зьнізіць непадзельныя фонды і выступаюць супроць сацыялістычнага накапленьня калгасаў, трэба нанесьці руйнуючы адпор.

Змагаючыся з палітычнай недаацэнкай справы разьмеркаваньня даходаў, Мсьціслаўшчына павінна выканаць важнейшую дырэктыву, у якой Белкалгасцэнтр «папярэджвае ўсе праўленьні калгасаў, калгасаюзы, земаддзелы і МТС супроць спроб разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю калгасаў праводзіць адміністрацыйным парадкам, падмяняючы актыўнасьць і самадзейнасьць шырокіх калгасных мас».

## Аванс па працаднёх—стымул павышэньня прадукцыйнасьці працы

КАПЫЛЬ. Увядзеньне зьдзельшчыны, дакладны ўлік працы і выдача натуральных авансаў выключна па працаднёх значна ўзьнялі прадукцыйнасьць працы ў калгасе «Пралетары». Дзякуючы гэтаму, сваячасова скончана сяўба азімых на плошчы 80 гэкт. і ўзьнята 95 гэкт. яравога (82 проц. пляну), засіласавана 76 тон зялёнай масы і загатоўлена яшчэ адна яма на 50 тон, падрыхтаваны хавальні і прыступлена 24 верасьня да капаньня бульбы.

Своечасовым скончэньнем уборкі бульбы калгас «Пралетары» павінен заваяваць перамогу.

В.

## 0,25 га на гаспадарку,—

### так падзялілі бульбу ў калгасе „Гай Беларусі“

КОЙДАНАВА. У калгасе «Гай Беларусі» поўнасьцю ўжыта кулацкая ўраўнілаўка пры разьмеркаваньні ўраджаю. Толькі гэтымі днямі па распараджэньні старшыні калгасу ХАМЕНКА на кожны калгасны двор адмерылі 0,25 га бульбы на корані. У выніку гэтага ў першы дзень капаньня амаль усе калгасьнікі вышлі на «свае» ўласныя кавалкі, а бульба аграмаджаная застаецца ня ўбранай. Калгасьнікі, якія, дзякуючы ударнай рабоце, выпрацавалі большую колькасьць працадзён, выступалі супроць кулацкай ураўнілаўкі, за разьмеркаваньне па колькасьці і якасьці працы. Праўленьне на чале са старшынём Хаменка не зважае на гэта ўвагі і працягвае сваю палітыку. Праўленцы забыліся, што неабходна забясьпечыць кормам у першую чаргу аграмаджаную жывёлу.

Апрача таго пры поўнай згодзе старшыні калгасу Хаменка, Будай і іншы калгасьнікі прадаюць частку бульбы на корані, якая цяпер лічыцца аграмаджанай. Цікава адзначыць, што пры арганізацыі калгасу і аграмаджаньні пасеваў ні Хаменка, ні Будай не заўважалі аб тым, што на іх полі паселна бульба іх знаёмых і зусім не прэчылі, калі іх зайсьвалі працадні за ўсю плошчу.

Пасьля гэтага ня дзіва, чаму Хаменка так упарта абараняе кулацкую ўраўнілаўку. З аднаго боку ён хоча сваю бульбу загнаць на прыватным рынку з другога — атрымаць для ўласнага карыстаньня бульбу з калгасу.

Неабходна ўжыць тэрміновыя меры для ліквідацыі кулацкай ураўнілаўкі і разьмеркаваньні бульбы ў калгасе «Гай Беларусі», старшыню калгасу Хаменка прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Гаеўскі.

## За тры месяцы ня ўлічаны працадні

ПАРЫЧЫ. У камуне «Мапады пенінец» за тры месяцы—ліпень, жнівень і верасень—ня ўлічаны працадні камунараў. Праўленьне да гэтага часу яшчэ не ўразумела, што без уліку нельга будаваць правільна разьмеркаваць ураджай. Адсутнасьць зьдзельшчыны і ўліку працы аслабляе працоўную дысцыпліну ў камуне. Некаторыя камунары па два месяцы ня выходзяць на работу.

З боку раённых арганізацый павінна быць узмоцнена жывое кіраўніцтва. У бліжэйшыя дні трэба ўлічыць усе працадні камунараў, увесьці зьдзельшчыну.

СКАВАРОДКА.

## *Аб ходзе збожжазагатовак*

### *Пастанова ЦК КП(б)Б ад 29 верасьня 1931 г.*

Адзначыць, што ход збожжазагатовак па БССР праходзіць нездавальняюча, як па колькасьці загатоўленага хлеба (па 25/IX загатоўлена 21,3 проц. гадавога пляну) так і па тэмпах разьвіцьця збожжазагатовак (3—3,5 проц. у пяціднеўку).

Адзначыць недапушчальныя адносіны да збожжазагатоўчай кампаніі з боку раёнаў: Каралінскага (1,4 проц. гадавога пляну збожжазагатовак), Вушацкага (2,3 проц.), Клічаўскага (3,6 проц.), Пятрыкоўскага (6,5 проц.), Чэрвеньскага (4,8 проц.), Асіпавіцкага (5,3 проц.). На сакратарыяце ЦК заслухаць даклады гэтых райкомаў аб загатоўках.

Такі ход збожжазагатовак тлумачыцца дрэннай работай загатоўчага апарату, як у цэнтры, так і на мясцох («Хлебжывотноводсоюз», Белкаапсаюз), недастатковым кіраўніцтвам органаў Наркамснабу, слабой увагай мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, наяўнасьцю існуючых на мясцох настроў аб немагчымасьці выкананьня плянаў па збожжазагатоўках, няправільнай практыкай складаньня збожжафуражных балянсаў у калгасах і ў адзінаасобных гаспадарках, пад якімі прыкрываецца па сутнасьці кулацкая лінія сарваць задачу збожжа дзяржаве, а таксама зусім недапушчальнымі апартуністычнымі адносінамі ў значнай колькасьці арганізацый да масава-палітычнай работы ў сувязі з загатоўкамі, з адначасовай наяўнасьцю фактаў адміністраваньня і зусім слабога націску на кулацка-заможную частку вёскі на здачы збожжа.

Выходзячы з гэтага, ЦК пастанаўляе:

**1.**

Абавязаць ГК, РК КП(б)Б, саўгаснакалгасную сыстэму і загатоўчыя арганізацыі павесьці рашучую барацьбу з правымі настроямі аб перэльтанасьці плянаў збожжазагатовак, з імкненьнем адцягнуць збожжазагатоўкі на больш позьні тэрмін, з практыкай няправільнага складаньня збожжафуражных балянсаў, як з праваапартуністычнай, кулацкай, накіраванай на зрыў выкананьня плянаў па загатоўках. Разгарнуць шырокую арганізацыйна-масавую работу сярод калгасьнікаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас за выкананьне плянаў загатовак, рашуча змагаючыся з фактамі адміністраваньня ў загатоўчай рабоце.

**2.**

Абавязаць Наркамзем (т. Рачыцкага) і саўгасныя сыстэмы (т. Грэбенчыка, Каралёва) пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць здачу прадукцыі саўгасамі (збожжа бульба) у тэрміны, устаноўленыя ЦК і СНК да 1/XI—1931 г. Даручыць РСІ праверыць заяву т. Балціна аб тым, што саўгаснымі цэнтрамі планы на здачы прадукцыі спушчаны са значным скажэньнем супроць тэрмінаў, устаноўленых ЦК і СНК, і ў выпадку падцьвярджэньня гэтага вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

**3.**

Даручыць Калгасцэнтру пад адказнасьць т. Міцькова, Трактарацэнтру пад адказнасьць т. Каршакевіча на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ажывіць работу калгаснай сыстэмы па здачы дзяржаве калгасамі лінкаў прадукцыі (збожжа, бульба, лён), на аснове разгортваньня пырокай масавай работы сярод калгасьнікаў. Павесьці рашучую барацьбу з спажывецкімі настроямі ў калгасах. Прапанаваць агітмасаваму аддзелу распрацаваць умовы і арганізаваць конкурс паміж калгасамі, сельсаветамі і раёнамі на лепшае і хутчэйшае выкананьне плянаў загатовак.

**4.**

ЦК катэгарычна напярэджвае партыйныя, савецкія і загатоўчыя арганізацыі супроць існуючай у радзе раёнаў недаацэнкі аднаасобнага сэктару па выкананьні пляну загатовак і прапануе на аснове масавай работы дабіваца поўнага выкананьня калтрактацыйных дагавораў і самаабавязацельстваў, прынятых бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі. Лічачы наяўнасьць у радзе раёнаў фактаў масавых штрафаў бядняцка-сераднякіх гаспадарак за невыкананьне плянаў загатовак, што зьяўляецца скажэньнем лініі партыі, вынікам няўменьня, а часта і нежаданьня паставіць на належную вышыню масава-палітычную работу, прапанаваць РК і РВК рашуча выправіць гэтыя скажэньні і змагацца з імі ў далейшай рабоце.

**5.**

Дабіцца да 10/X—1931 г. выкананьня цьвёрдых заданьняў кулацка заможнай часткай і ў выпадку невыкананьня ёю ў гэты тэрмін заданьняў, прыцягваць да судовай адказнасьці і накладваць штрафы. Катэгарычна напярэдзіць яшчэ раз партарганізацыі аб тым, каб пад цьвёрдыя заданьні не папалі сераднякія гаспадаркі.

**6.**

Адзначаючы невыкананьне загатоўчым апаратам пастановы ЦК і СНК аб стварэньні шырокай сеткі сельпуўпаўкажаных па загатоўках, вылучэньні членаў сельсаветаў і інш., іх прэміраваньні за пасьпяховае выкананьне плянаў загатовак, а таксама слабы кантроль з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый за выкананьнем гэтай пастановы, даручыць Наркамснабу пад адказнасьць т. Балціна, Хлебжывёлсаюзу пад адказнасьць т. Журомскага і Белкаапсаюзу пад адказнасьць т. Шчацько, дабіцца зараз-жа ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў. РК і РВК устанавіць дакладны кантроль за правядзеньнем гэтай пастановы на мясцох.

**7.**

Ухваліць пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб мабілізацыі 45 таварышоў на ўзмацненьне загатоўчай кампаніі. Прапанаваць усім мабілізаваным таварышом, якія яшчэ ня выехалі на працягу сутак, выехаць у раён. Агітмасаваму аддзелу праверыць выкананьне гэтай пастановы. Дадатковa мабілізаваць 10-15 чалавек членаў ЦК, наркомаў або намесьнікаў для дапамогі мясцовым арганізацыям у загатоўках. Прапанаваць загатоўчым сыстэмам зьнішчыць гастралёркія паездкі па раёнах як мясцовых так і цэнтральных работнікаў, прапанаваць РК партыі ўстанавіць такі кантроль, каб кожны прыяжджаючы працаўнік у раён або сельсавет, адказваў за канкрэтную работу і ў выніку давалася б ацэнка яго работы мясцовымі арганізацыямі.

**8.**

Улічваючы, што кастрычнік зьяўляецца рашаючым у збожжазагатоўках абавязаць РК КП(б)Б і загатоўчыя арганізацыі дабіцца да 1 лістапада выкананьня 65 проц. гадавога пляну збожжазагатовак, шырока разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў правядзеньні збожжазагатовак, у прыватнасьці зьвярнуць увагу на якасьць здаванага збожжа.

**9.**

Указаць сэктару друку Культпропу ЦК на дрэннае выкананьне друкам (як цэнтральным так і мясцовым) пастановы бюро ЦК ад 18/VIII аб мабілізацыі друку на барацьбу за збожжа, прапанаваўшы прыняць такія меры, каб пытаньні загатовак ня сходзілі са старонак друку да поўнага выкананьня пляну.

*Сусьветныя гіганты—заводы „АМО“ і ХТЗ*

# *УЧОРА ПУШЧАНЫ У ХОД*

### *ВЯЛІЗАРНЕЙШАЯ ПЕРАМОГА ЛЕНІНСКАЙ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ*

## „Калі пасадзім СССР на аўтамабіль, а мужыка на трактар“...

„Пралетарская рэвалюцыя ўзбройваецца новымі мільёнамі мэханічных коняй. Наша краіна пускае сёньня два заводы: АЎТАМАБІЛЬНЫ НОВЫ «АМО» І ХАРКАЎСКІ ТРАКТАРНЫ ІМЯ АРДЖАНІКІДЗЭ.

Масква—сталіца першай пралетарскай дзяржавы, сталіца сусьветнай рэвалюцыі — атрымлівае САМЫ БУЙНЫ Ў СЬВЕЦЕ ЗАВОД ГРУЗАВЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ — АМО.

На акраіне Масквы, горада, да якога накіраваны рэвалюцыйныя мары рабочых усяго сьвету, узрос Дэтройт, але бяз Форда. Тут, на гэтым месцы, у 1916 годзе пачаў будаваць аўтамабільны завод Рабушынскі, які ў 1917 годзе пагражаў задушыць рабочых «насьцьлявай рукой голаду». Рабушынскі абкіраў казну і завод, вядома, не пабудаваў. Ён яўна перашаніў сілы і здольнасьці расійскага капіталізму, калі ўзяўся за гэта будаўніцтва.

ХАРКАЎ — сталіца Савецкай Украіны — атрымлівае буйнейшы ў сьвеце трактарны завод МАГУТНАСЬЦЮ Ў 50.000 ТРАКТАРАЎ ТЫПУ «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» У ГОД.

Украіна — індустрыяльная пэрла Саюзу. Цар у саюзе з замежнымі капіталістамі гаспадарыў на Украіне, як у адной з сваіх шматлікіх калёній. Індустрыялізацыя Украіны па-сапраўднаму пачалася толькі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мэханізацыя Данбасу, сацыялістычная рэканструкцыя украінскай мэталюргіі, дзесяткі новых заводаў, фабрык, машынна-трактарных станцый!

Калі грузавікі АМО і трактары ХТЗ пойдуць канвэерам, іх будзе суправаджаць новая хваля ўздыму, радасьць працоўных усёй нашай пралетарскай бацькаўшчыны і магільнае маўчаньне фордаўскіх, «фіатаўскіх» і інш. капіталістычных буйных прадпрыемстваў, якія скованы прагрэсыўным параліюшам сусьветнага эканамічнага крызісу. Вялізарныя прадпрыемствы капіталізму мёртвыя, або паўмёртвыя. Няхай сёньня ўсе капіталістычныя і сацыял-фашысцкія прароцкі, якія прадракалі нашу пагібель і росквіт капіталізму, — няхай яны пераверацъ, як рэалізуюцца іх нікчэмныя прароцтвы. Капіталізм даў задні ход. Ён ня можа затрымаць і прывесьці ў рух нават таго, што ім было створана. Ім, капіталістам, не да будаўніцтва і пускі новых прадпрыемстваў, калі існуючыя працуюць з няпоўнай нагрузкай, бязьдзейнічаюць. Ідэолёгі капіталізму эпохі заходу — блізарукія, рэакцыйныя, тупыя — адкрываюць паход супроць машын, супроць тэхнікі.

ПУСК КОЖНАГА НОВАГА ПРАДПРЫЕМСТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ, АСАБЛІВА ПУСК ТАКІХ ГІГАНТАЎ, ЯК «АМО» І ХТЗ — ПЕРАМОГА САВЕЦКАЙ СЫСТЭМЫ, ЛЕНІНСКАЙ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ. Пры значна большым тэхнічным вопыце за мяжой, пры яе значна больш высокім узроўні тэхнічнага разьвіцьця, пры яе значна большай тэхнічнай узброенасьці капіталістычная эканоміка разлагаецца, гніе, СССР квітнее і бярэ адну за другой вышыні тэхнікі.

Клясавыя супярэчнасьці на даным этапе разьвіцьця імпэрыялізму душаць тэхніку. Мы зьнішчылі капіталістаў і памешчыкаў, як клясу яшчэ ў Кастрычніку. Мы зараз, на базе суцэльнай калектывізацыі, ліквідуем апошнюю эксплёататарскую клясу — кулацтва. Гэтым створаны грандыёзныя і необмежаваныя магчымасьці для разьвіцьця вытворчых сіл. Але магчымасьць не ператвараецца ў сапраўднасьць аўтаматычна. Ленінская партыя, палітыка яе Цэнтральнага Камітэту, адзінства нашай партыі, найвялікшае давер'е мас да свайго авангарда—гэта тыя палітычныя вагары, пры дапамозе якіх дасягаецца гістарычная мэта рабочага руху — сацыялізм.

АМО і ХТЗ сьведчыць, што пёзунг тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай рэалізуецца хуткімі тэмпамі, што барацьба партыі за аўладаньне тэхнікай завяршыцца буйнымі посьпехамі. І сёньня ўвага краіны групуецца ня толькі на АМО і ХТЗ, але і на сталінградзкім трактарным заводзе, які хутка ідзе да поўнага аўладаньня сваёй канчатковай магутнасьцю. ВЫПУСК 100 ТРАКТАРОЎ У ДЗЕНЬ ЗА АПОШНІ ЧАС — ГЭТА АДНА З НАЙВЯЛІКШЫХ ПЕРАМОГ. Упяршыню мы навучыліся ўладаць масавым прадпрыемствам на базе такой высокай тэхнікі. Уласна кажучы, толькі зараз завяршыцца посьпехам леташні пуск сталінградзкага трактарнага заводу. Гэты посьпех—заўтрашні дзень новых гігантаў.

ПУСК ЗАВОДАЎ СУПАДАЕ З ПАЧАТКАМ АПОШНЯГА КВАРТАЛУ ГАСПАДАРЧАГА ГОДУ. Чацьверты квартал ва многім вырашае агульныя вынікі ўсяго году. Гэты квартал павінен пакрыць вялікую запазычанасьць папярэдніх месяцаў.

Вялікія палітычныя і гаспадарчыя задачы. Але і вялікія новыя рэзэрвы. Квартал пачынаецца пускам двух гігантаў і буйнымі перамогамі сталінградзкага трактарнага. У бліжэйшыя дні і тыдні ўступаюць у строй гонар трэцяга году пяцігодкі — Магнітагорскія і Кузьнецкія домны і яшчэ многія і многія прадпрыемствы. Гэта ўсе вялізарныя сілы, якія запрагнуцца ў праграму чацьвертага кварталу 1931 году.

Вугаль, мэталь, транспарт, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, правядзеньне асеньняе-пасеўнай і збожжазагатоўчай кампаніі — навакол гэтых сапраўды рашаючых вузлавых задач партыя мабілізуе ўвагу ўсіх працоўных краіны.

Усе гэтыя задачы рэальныя. Тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў паставіў пытаньне: «Ці рэальная наша вытворчая праграма?» і адказаў «Бязумоўна, рэальная». Яна рэальная хаця-б таму, што ў нас ёсьць усе неабходныя ўмовы для яе ажыцьцяўленьня. Яна рэальна хаця-б таму, што яе выкананьне залежыць цяпер выключна ад нас саміх, ад нашага ўменьня і нашага жаданьня скарыстаць багацейшыя магчымасьці, якія ёсьць у нас.

У гэтым годзе рабочая кляса вельмі вырасла, палітычна загартавалася, больш аўладала тэхнікай. Рабочыя і спэцыялісты нашай краіны пабудавалі АМО, ХТЗ, будуюць Магнітагорск, Кузьнецк, Бабрыкоўскі, Бярэзьнікаўскі і Васкрасенскі камбінаты, стварылі Блюмінг і яго электрычнае сэрца, штодзённа ўліваюць новых сто трактараў, пусьцілі і пускаюць у ход дзесяткі новых сусьветных гігантаў, якія мяняюць твар нашай вялікай краіны. Ёсьць гарантыя выкананьня плянаў, ёсьць гарантыя выкананьня задачы «дагнаць і перагнаць» максымум у дзесяць год.

— Мы становімся краінай мэтапічнай краінай аўтамабілізацыі, краінай трактарызацыі і калі пасадзім СССР на аўтамабіль, а мужыка на трактар — няхай паспрабуюць дагнаць нас паважаныя капіталісты, якія чваняцца сваёй цывілізацыяй». Мы яшчэ паглядзімо, якія краін магчыма тады будзе «определить у адсталыя і якія ў перадавыя».

(«Правда»).

## Прывітаньне тав. СТАЛІНА

### РАБОЧЫМ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАМУ ПЭРСАНАЛУ ХАРКАЎСКАГА ТРАКТАРАБУДУ

З вялізарнай увагай працоўныя нашай краіны, мільёны калгасьнікаў і партыя сачылі за ходам будаўніцтва харкаўскага трактарнага заводу. Харкаўскі Трактарабуд гэта—сталёвы аплот калектывізацыі сельскай гаспадаркі Украіны, будаўнікі яго—авангард, які вядзе мільёны украінскіх сялян па шляху да сацыялізму. Будаўніцтва харкаўскага трактарнага заводу, які ўступае ў сям'ю трактарных заводаў, застанецца ў гісторыі сацыялістычнай індустрыі нашай краіны ўзорам сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў.

ЦК УсеКП(б) выказвае ўпэўненасьць, што рабочыя інжынэрна-тэхнічны пэрсанал пераможа труднасьці маладой вытворчасьці, скарыстае вопыт сталінградзкага заводу і дабіцца выкананьня баявой праграмы 1932 году.

Гарачае бальшавіцкае прывітаньне будаўніком другога ў СССР трактарнага гіганту.

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. СТАЛІН.

## РАБОЧЫМ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАМУ ПЭРСАНАЛУ „АМО“

З вялікім здавальненьнем ЦК УсеКП(б) адзначае перамогу рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу «АМО». Там, дзе рускія капіталісты маглі пабудаваць аўтамабільныя майстэрні з адсталай тэхнікай, нізкай прадукцыйнасьцю працы, барбарскімі прыемамі эксплёатацыі—створан магутны гігант з прадукцыйнасьцю ў 25.000 грузавых машын з дастасаваньнем усіх дасягненьняў сучаснай тэхнікі. Ваша перамога, гэта перамога ўсіх працоўных нашай краіны. ЦК УсеКП(б) выказвае непахісную ўпэўненасьць, што за гэтай першай вялікай перамогай пасьледуюць вашы другія перамогі, зьнішчэньне страт вытворчасьці і высокая якасьць прадукцыі.

Гарачае бальшавіцкае прывітаньне ўсім будаўніком першага ў СССР аўтагіганта—заводу „АМО“.

Сакратар ЦК УсеКП(б) СТАЛІН.

# Нізавому зьвяну камсамольскай арганізацыі—
## ШТОДЗЁННАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА

ДАПАМАГЧЫ ЛЕНІНСКАМУ КАМСАМОЛУ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАВЫСІЦЬ СВОЙ УДЗЕЛ У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, ПЕРАТВАРЫЦЦА У ШМАТМІЛЬЁННУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ—АДКАЗЬНЕЙШАЯ ЗАДАЧА КОЖНАЙ ЯЧЭЙКІ КП(б)Б

## За высокую якасьць парткіраўніцтва камсамолам

Камсамол павінен павысіць сваю ролю на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, павінен ператварыцца ў шматмільённую арганізацыю. Гэтыя адказныя задачы, пастаўленыя перад ленінскім камсамолам, патрабуюць ад усіх партыйных арганізацый і ячэек паляпшэньня якасьці партыйнага кіраўніцтва.

Высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны і сацыялістычная рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуюць ад камсамольскай арганізацыі перабудовы сваёй работы, перанясеньня цэнтру цяжару яе ў нізавое вытворчае зьвяно. Вярбоўка рады ленінскага камсамолу рабочай патрацкай і перадавой колгаснай моладзі ставіць задачу — выхаваць у ленінскім духу той маладняк, які ўліваецца ў камсамол.

З практычным вырашэньнем гэтых задач камсамольскія арганізацыі ня змогуць справіцца без рашучага паляпшэньня партыйнага кіраўніцтва камсамолам з боку ўсіх нізавых арганізацый КП(б)Б.

Калі ў апошні час мы можам канстатаваць значнае паляпшэньне кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі з боку раённых камітэтаў КП(б)Б, то гэтага нельзя сказаць у адносінах нізавых парт'ячэек. Рад партыйных калектываў фабрык і заводаў, рад вытворчых і колгасных парт'ячэек усё яшчэ ня здолелі надзіць пастаяннага сыстематычнага кіраўніцтва работай камсамольскіх ячэек. Ёсьць яшчэ цэлы рад момантаў простай, па сутнасьці апартуністычнай недаацэнкі в боку асобных кіраўнікоў парт'ячэек і некаторых членаў партыі пытаньняў партыйнага кіраўніцтва камсамолам. Рад партыйных арганізацый не зразумелі ўсёй палітычнай важнасьці лёзунгу ператварэньня камсамолу ў шматмільённую арганізацыю. Аб гэтым гаворыць рад канкрэтных фактаў. На Віцебскім лесазаводзе № 13 за апошнія тры месяцы ў камсамол завербаваны толькі 3 чалавекі. Бюро калектыву КП(б)Б ня ўжывае ніякіх захадаў для таго, каб ліквідаваць прарыў на важнейшым вучастку камсамольскай работы. Ёсьць факты і простага ігнараваньня важнейшай палітычнай задачы, пастаўленай перад камсамолам. Партрымацаваны тав. Івакоўскі (фабрыка «Дзьвіна») аказвае адкрытае супраціўленьне вярбоўцы ў камсамол рабочай моладзі. Ён адважыўся адкрыта заявіць наступнае: «Я ня згодзен з лёзунгам 100-процантнага ахопу рабочай моладзі камсамолам і таму партрымацаваны да камсамолу працаваць ня буду». Аналёгічную думку выказаў і салдат-ветэран пар'ткалектыву фабрыкі «Камунарка» (Менск).

Асабліва абураючыя факты апартуністычнай недаацэнкі ролі камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве паглядаліся ў Сурскай арганізацыі. Там член бюро райкому партыі тав. Афанасенка на пасяджэньні бюро райкому выступіў з яўна апартуністычнымі ўстаноўкамі, імкнуўся даказаць няўпасьць «крызісу актыўнасьці ў камсамоле». І горш за ўсё тое, што гэты апартуніст не атрымаў жорсткага адпору в боку бюро райкому КП(б)Б.

Некаторыя парт'ячэйкі надзвычай павярхоўна і безадказна адносяцца да кіраўніцтва камсамолам. У Курынскай ячэйцы КП(б)Б партрымацаваным да камсамолу быў вылучан фактычна беспартыйны таварыш.

У асобных мясцох некаторыя кіраўнікі парт'ячэек штодзённае бальшавіцкае кіраўніцтва камсамолам падмяняюць дробнай апекай, падмяняюць нікому непатрэбным камандаваньнем.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што раённыя партарганізацыі павінны яшчэ раз праверыць, наколькі нізавыя парт'ячэйкі паляпшаюць сваё кіраўніцтва камсамолам, наколькі гэта кіраўніцтва па сваім зьмесьце добразнаснае. Раённыя камітэты партыі павінны ўжыць усе меры для таго, каб дырэктывы цэнтральных парторганаў аб кіраўніцтве камсамолам былі цалкам ператвораны ў жыцьцё.

У якім напрамку павінна ісьці паляпшэньне зьместу партыйнага кіраўніцтва камсамолам?

Перш за ўсё трэба дабіцца, каб партрымацаванымі вылучаліся сапраўды стойкія, вытрыманыя члены партыі, якія ведаюць работу камсамолу, якія ёю цікавяцца. Па-другое, зараз справа заключаецца ў тым, каб на толькі забясьпечыць партыйным кіраўніцтвам калектывы і ячэйкі ЛКСМ. Зараз задача зводзіцца да таго, каб забясьпечыць пастаянным партыйным кіраўніцтвам камсамольскія брыгады і групы, дабіцца поўнага перанясеньня цэнтру цяжару камсамольскай работы ў нізавое вытворчае зьвяно. Без падбору лепшых таварышоў і вылучэньня іх партрымацаванымі, без забясьпячэньня парткіраўніцтвам нізавых камсамольскіх зьвеньняў на фабрыках, заводах, у саўгасах і калгасах, мы ня здолеем ісьці наперад на шляху паляпшэньня парткіраўніцтва камсамолам.

Пашырэньне парт'ядра ў камсамоле—адзін з важнейшых момантаў у справе паляпшэньня парткіраўніцтва камсамолам. На гэты вучастак работы парт'ячэйкі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу.

За апошні час у камсамольскіх арганізацыях узьнікаюць настрої аб нямэтазгоднасьці вылучэньня партрымацаваных. Гэтым настроям трэба даць самы бязьлітасны адпор.

«Забясьпячэньне кіраўніцтва партыі ёсьць самая галоўная і самая важная задача ва ўсёй рабоце камсамолу» (Сталін). Аб гэтым павінен памятаць кожны член партыі, кожны камсамолец.

Г. Фіялкін.

## Прарывы ў рабоце камсамолу--рэзультат слабога парткіраўніцтва

Партыйнае кіраўніцтва работай камсамольскіх арганізацый у Крупскім раёне пастаўлена надзвычай дрэнна. Рад партыйных ячэек зусім ня цікавяцца работай ячэек ЛКСМБ і ня кіруюць імі. Ня лепш адносіцца да гэтай справы і Крупскі РК КП(б)Б.

РК ЛКСМБ бязьдзейнічае. Сакратар райкамолу ня ведае нават аб тым, што робіцца ў камсамольскіх ячэйках па раёне.

У выніку ў рабоце камсамольскіх арганізацый Крупскага раёну маюць месца значныя прарывы. Камсамольскія ячэйкі ня прымалі ніякага ўдзелу ў такой адказьнейшай, падшэфнай камсамолу кампаніі, як сіласаваньне, якое, да рэчы, па раёне праваліла. Значная частка вясковых камсамольскіх ячэек стаяць у баку ад работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, не зьяўляюцца ініцыятарамі ў справе ўкараненьня зьдзельшчыны і разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах.

Ніякай палітвыхаваўчай работы сярод камсамольцаў не праводзіцца. Быў выпадак, калі ў калгасе «Бальшавік» некаторыя камсамольцы адмовіліся выйсьці на ўборку жыта толькі таму, што была нядзеля.

Усе гэтыя факты бязумоўна зьяўляецца простым вынікам таго, што партыйныя ячэйкі Крупскага раёну яўна недаацэньваюць парткіраўніцтва камсамолам. Зараз, калі значна павялічваецца роля камсамольскіх арганізацый у выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных задач, калі перад камсамолам пастаўлена задача ператварэньня сябе ў шматмільённую арганізацыю, парткіраўніцтва камсамолам набывае асабліва важнае значэньне. Партыйная арганізацыя Крупскага раёну павінна зараз-жа выправіць недахопы на адказьнейшым вучастку работы.

Аймор.

## Пераключыцца на арганізацыю работы ў калгасах

У апошні час СЛУЦКАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ значна павысіла свой удзел у справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Некаторыя калгасныя ячэйкі ЛКСМБ (калгас «Колас», «Батрак» і інш.) поўнасьцю перанеслі цэнтр цяжару сваёй работы на гэты адказьнейшы вучастак сацыялістычнага будаўніцтва.

Камсамольская ЯЧЭЙКА КАЛГАСУ «КОЛАС» (Бокшыцкі сельсавет) арганізавала ў вёсцы Васілінкі калгас і зараз разгортвае ў ім работу па аграмаджаньні маемасьці. Камсамольцы гэтай-жа ячэйкі ўцягнулі ў свой калгас 10 бядняцка-середняцкіх гаспадарак.

Сіламі камсамольскай ЯЧЭЙКІ м. ЛЕНІНА за апошні пэрыяд уцягнута ў калгас 20 гаспадарак. Аналёгічныя рэзультаты работы ёсьць і ў радзе іншых камсамольскіх ячэек раёну.

Зараз камсамольская арганізацыя павінна асаблівую ўвагу зьвярнуць на арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў. Увядзеньне зьдзельшчыны, ліквідацыя абязьлічкі ў рабоце і ўраўнілаўкі ў аплаце працы, правільнае разьмер каваньне ўраджаю ў калгасах—павінны заняць цэнтральнае месца ў рабоце камсамольскіх ячэек.

Я. Ж.

## Марчанка зрывае перадачу камсамольцаў у партыю

Бюро парт'ячэйкі Чырвонаборскага лесазаводу (Хойніцкі раён) зусім ня кіруе работай камсамолу. На заводзе ёсьць ня мала перадавых камсамольцаў, якіх даўно пара перадаць у партыю, аднак, сакратар Чырвонаборскай парт'ячэйкі тав. Марчанка ня лічыць сваім абавязкам займацца гэтай справай. Рад камсамольцаў падалі заявы ў бюро парт'ячэйкі, але гэтыя заявы кладуцца пад сукно і не разглядаюцца.

У выніку такіх недапушчальных адносін з боку бюро парт'ячэйкі да прыёму лепшых камсамольцаў заводу ў партыю сярод пэўнай часткі камсамольцаў узьнікаюць нездаровыя настрої. Ёсьць выпадкі, калі некаторыя камсамольцы, не дачакаўшыся разгляду сваіх заяў, здаюць у бюро камсамольскія білеты.

Хойніцкі райком партыі павінен неадкладна зацікавіцца гэтай справай і паказаць тав. Марчанку на тое, як трэба адносіцца да выкананьня такой важнай задачы, як рост партыі за лік лепшых камсамольцаў.

Г.

### Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б ад 26-IX—31 г. аб выкананьні пастановы ЦК пра газэтныя кадры

Задачы, пастаўленыя перад цэнтральным друкам, патрабуюць сыстэматычнага паляпшэньня складу яго працаўнікоў за лік лепшых рабкораў-ударнікаў. Менская гарадзкая арганізацыя КП(б)Б, як адна з перадавых арганізацый, павінна прынясьці самы актыўны ўдзел у выкананьні пастановы ЦК КП(б)Б ад 28 мая 1931 г. аб газэтных кадрах.

Выходзячы з гэтага Культпропу разам з аддзяленьнем кадраў ГК

1. Вылучыць з ліку менскіх рабкораў-ударнікаў 20 чалавек на пастаянную адказную рэдакцыйную работу ў рэдакцыях цэнтральных газэт, з якіх 8 чалавек для рэдакцыі «ЗЬВЯЗДА».

Выходзячы з гэтага, бюро Менгарму разам з аддзяленьнем кадраў ГК разьмяркаваць тэрмінова гэту колькасьць паміж буйнымі вытворчымі парткалектывамі. Парткалектывам правесьці намечаныя кандыдатуры праз рабочыя сходы.

2. Даручыць культпропу гаркому і парткалектыву рэдакцый арганізаваць для падрыхтоўкі гэтых вылучэнцаў 6-цітыднёвыя курсы.

3. Прапанаваць парткалектыву рэдакцый цэнтральных газэт прыняць актыўны ўдзел у намачэньні кандыдатур і іх разьмеркаваньні.

4. Прапанаваць ячэйкам КП(б)Б БАН, усебеларускіх прафкурсаў і парткалектыву ВСНГБ прасачыць за работай і скарыстоўваньнем у рэдакцыях прымацаваных асьпірантаў, курсантаў і гаспадарнікаў.

5. Парткому Камвузу прасачыць за сваячасовым вылучэньнем студэнтаў для работы ў рэдакцыях у парадку практыкі.

6. Надаючы вялікае значэньне рабоце ў рэдакцыях газэт у парадку сацсумяшчэньня лепшых рабкораў - ударнікаў, а таксама спэцыялістаў, гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў, лічыць работу ў рэдакцыях у парадку сацсумяшчэньня асноўнай грамадзкай нагрузкай. Фракцыі гарпрафсавету даць указаньне фабзаўмясцкомам.

7. Культпропу гаркому КП(б)Б праз тры тыдні дапаможыць бюро аб выкананьні гэтай пастановы.

8. Пастанову апублікаваць у друку.

Секретар бюро Менгаркому КП(б)Б Ф. Ф. Ісаенкаў.

Старшыня Менгарвыканкому Ф. Ф. Ісаенкаў.

Старшыня Менгарсавету Ф. Ф. Ісаенкаў.

Старшыня Менгарпрофсавету Ф. Ф. Ісаенкаў.

Старшыня Менгарпартколегіі

# АПАРАТ ГОРАЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ НЕАДКЛАДНА ПАВІНЕН БЫЦЬ АЗДАРОЎЛЕН

ГОРКІ. У часе абсьледаваньня спажывецкай каапэрацыі гораду і раёну, выяўлены рад вялікіх фактаў.

Шякай вынікасьці ў працы німа. Усе гаспадарча-палітычныя кампаніі праходзяць без удзелу каапэрацыі. Найлепшыя і каапэрацыйныя кадры ў працу каапэрацыі ня ўцягнуты, грамадзкі кантроль над работай каапэрацыі ня створан.

Адозва СНК і ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б не распрацавана. Каапэрацыя не перабудавала сваёй работы па-новаму.

Як вынік, у працы спажывецкай каапэрацыі ёсьць шмат прарываў. Заказваньне па спажывецкай каапэрацыі дасягнула на 15-га верасьня звыш 100 тыс. рублёў. Мабілізацыя ороджаў сарвана, за 3 кварталы выканана толькі на 30 проц., а па гарпо — на 36 проц. Ня лепш стаіць справа з выкананьнем пляну па ўсіх відах загатовак.

Грамадзкае харчаваньне не перабудавана ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК. Абеды ў рабочых сталоўках надта дрэнная якасьці. Бруд, антысанітарнае станоўішча сталовак — звычайнае зьяўішча.

Паўстае пытаньне, чым-жа займаліся кіраўнікі райсаюзу і гарпо?

Бязьдзейнасьць, злосная ігнараваньне дырэктыў партыі і ўлады, злоўжываньні і самазабесьпячэньне — вось што характарызуе кіраўніцтва райсаюзу і гарпо.

Намесьнік старшыні гарпо, Левіна, забясьпечыла сябе на некалькі гадоў уперад абуткам, адзеньнем і мануфактурай і загатовіла вялікія прыпасы харчоў. Старшыня гарпо Пых — ботамі, адзеньнем, мануфактурай і г. д. Старшыня райсаюзу Тваароўскі і адказны выканаўца забесьпячэньня. Рахлін — дэфіцытнымі таварамі і мануфактурай. Махорка, прызначаная для веснавой пасеўнай кампаніі, скрынкамі абменьвалася на рынку на яйкі і масла для асабістых патроб вышэй паказаных асоб. Па прыкладзе «начальства», самазабесьпечваліся работнікі прылаўка і сельскіх спажывецкіх таварыстваў. Кацілеўскае сельскае спажывецкае таварыства, атрымаўшы мануфактуру для промій калгасам, раздала яе не па прызначэньні, забясьпечыўшы ў першую чаргу старшыню сельсавету Крупаціна і старшыню сельсавету Гурскага. Атрыманыя боты на прэміраваньне сьвіназдатчыкаў ішлі на патрэбу Крупаціна і Гурскага.

Ня лепш стаіць справа ў Ленінскім сельскім спажывецкім таварыстве, дзе на чале самазабесьпячэньня былі старшыня сельсавету Талтуноў, сакратар парт'ячэйкі Дзянісенка.

Прамтавары, прызначаныя для прэміраваньня, браліся сабе і раздаваліся знаёмым.

Апарат спажыўкаапэрацыі засьмечаны клясава-варожым элемэнтам і на справу каапэрацыі глядзіць, як на «дойную карову». Былы загадчык цэнтральным складам Браўда, краў сякеры, махорку і прадаваў іх па спэкуляцыйных цэнах.

У радзе крам ёсьць растраты.

Райсаюз і гарпо, меўшы «лішкі» дэфіцытных тавараў і прадуктаў харчаваньня, зрабілі наступны тавараабмен з Шклоўскім гарпо. Шклоў атрымаў 24 скуранныя курткі, 20 пар ботаў, 100 гарнітураў, макароны, гарох і інш. тавараў на суму 5.748 рублёў 10 кап., у абмен ад Шклова, атрымана курыцельная папера, папяровыя кулькі, блёкноты і розныя цацкі на суму 9.336 рубл. За гэту апэрацыю прадстаўнік Шклоўскага гарпо атрымаў ад работнікаў Горацкага гарпо асабістую ўзнагароду — кулёк цукру ў 6 пудоў і казалак аксаміту звыш 6 мэтраў.

13-га жніўня на агульна-гарадзкім міжсаюзным сходзе членаў прафсаюзаў, намесьнік старшыні гарпо Левіна павінна была зрабіць даклад аб працы гарпо ў сувязі з агладам. Левіна зрабіць даклад адмовілася, а калі распачаліся спрэчкі па дакладу абсьледаваўшай брыгады аб хворых зьявішчах гарпо і асабліва па адрасе Левіная, апошняя дэманстрацыйна пакінула сход.

Горацкі раённы камітэт КП(б)Б ня выканаў дырэктывы ЦК партыі аб перабудове партыйнай работы ў каапэрацыйных установах і прадпрыемствах ў адпаведнасьці з паказаньнямі ЦК КП(б)Б.

Партыйная праца не перабудавана. Адзіная пастанова РК у жыцьцё не праведзена. Раённы камітэт КП(б)Б прымірэнцкі падышоў да членаў партыі, якія замешаны ва ўсіх гэтых шкодніцкіх справах.

Намесьнік загадчыка гарпо тав. Левіна — замест партпакаяньня атрымала пуцёўку ў ВНУ. Гэты факт не адзіны.

У бліжэйшы час горацкія каапэратары дадуць адказ аб злоўжываньнях пралетарскаму суду.

Але-ж гэтага мала. Трэба зараз-жа правесьці чыстку каапэрацыйнага апарату ад клясавага-чужога элемэнту.

Горацкая партыйная арганізацыя павінна неадкладна забясьпечыць перабудову спажывецкай каапэрацыі ў адпаведнасьці з адозвай СНК і ЦК.

Флеер.

## ДУБРОВЕНСКІЯ КААПЭРАТАРЫ

# ігнаруюць патрэбы спажыўца

ДУБРОЎНА. Пастановы партыі і ўраду аб перабудове работы каапэрацыі ў Дубровенскім гарпо ня выконваюцца. У справе абслугоўваньня і забесьпячэньня пайшчыкаў, рашучага пералому ў каапэрацыі ня зроблена. Усе дэфіцытныя тавары разьмяркоўваюцца сярод усіх пайшчыкаў, тады як пайшчыкі, якія ўнесьлі авансы, атрымліваюць прамтавары ў апошнюю чаргу. Членскія ўносы з пайшчыкаў не спагняюцца. Працуюць усе магазыны ня больш, як па 7 гадз. у суткі. Выходны дзень ва ўсіх крамах аўторак. Часта прыязджаюць калгасьнікі здалёку і, нічога ня купіўшы, вяртаюцца дамоў.

У аўторак усе склады, крамы і праўленьне гарпо не працуюць. У гэты дзень асабліва шырока разьвіваецца вольная спэкуляцыя прамтаварамі, якія атрыманы ў каапэрацыі.

Адпаведным органам трэба зацікавіцца работай Дубровенскай спажывецкай каапэрацыі і гарпо. Трэба праверыць сацыяльны склад работнікаў каапэрацыйнага апарату. Дубровенская спажывецкая каапэрацыя і гарпо маюць усе аб'ектыўныя ўмовы для таго, каб на справе выканаць дырэктыву партыі аб перабудове каапэрацыі.

Брыгада друку: ГРЭБІНЧУК і ЧАРНЯЎСКІ.

## *Арганізуем сьвінаадкорм у сыстэме сельскай спажывецкай каапэрацыі*

У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня пастановы ЦК партыі і СНК аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі — прэзыдыум Белкаапсаюзу даў заданьне па адкорме сьвіней у сельскіх спажывецкіх таварыствах. 85.000 сьвіней павінны быць пастаўлены на адкорм райспажыўсаюзамі і сельспажыўтаварыствамі, з гэтага ліку ў IV квартале 1931 г. павінна быць пастаўлена 20.000 сьвіней, а астатнія ў 1932 г.

Уся справа адкорму сьвіней павінна быць пабудавана гаспадарчым спосабам і праводзіцца на поўным гаспадарчым разрахунку. Кожнае сельспажыўтаварыства павінна загатовіць 4-5-месячных парасят, прыстасоваць сьвінарнікі з розных сялянскіх будынкаў і паставіць на адкорм ня менш 30-35 сьвіней. Кармы павінны набывацца звыш плянавых загатовак, скарыстаньнем розных адкідаў, зьбіраньнем жалудоў, а таксама шырокім практыкаваньнем заключэньня ўмоў на адкорм сьвіней з калгасьнікамі і адпаведнасьці з адозвай СНК і ЦК.

Флеер.

## Бандарэнка адкладвае сілясаваньне на будучы год

ЦЕРАХАЎКА. Большасьць сельсаветаў раёну да сілясаваньня яшчэ не прыступілі. Паводле пляну трэба засілясаваць 10.000 тон. На 14 верасьня плян сілясаваньня выканан толькі на 5 проц.

Паасобныя парткомы і калгасы апартуністычна недаацэньваюць пытаньне стварэньня кармовай базы. Так, сакратар Церахаўскага сельпарткому тав. БАНДАРЭНКА гаворыць: «часу для сілясаваньня яшчэ хопіць, а калі ня хопіць у гэтым годзе, дык можна перанесьці на другі год».

Калгас «Новы шлях» вусім адмаўляецца ад сілясаваньня, матывуючы гэта тым, што ў іх хопіць сена. Саўгас «НАСОВІЧЫ» замест 566 тон засілясаваў 65. У гэтым-жа саўгасе пабудавана вежа на 300 тон, якая дагэтуль не запоўнена. Некаторыя калгасы, як калгас імя Х зьезду ЛКСМБ, нічога не засілясаваўшы, прысылае ў райкалгассаюз хлусьлівыя весткі аб засілясаваньні 30 тон.

Пляны сілясаваньня райкалгассаюзам да ўсіх калгасаў не даведзены.

Не адкладваючы на будучы год Церахаўская арганізацыя павінна зараз-жа ўзяцца за выкананьне пляну сілясаваньня.

Юркевіч.



# Збожжазагатоўкі УСТУПІЛІ У РАШАЮЧЫ ЭТАП

## У ПЕРШАЙ ПЯЦІДНЕЎЦЫ КАСТРЫЧНІКА ПОЎНАСЬЦЮ ЛІКВІДАВАЦЬ ВЕРАСЬНЕЎСКІ ПРАРЫЎ

## АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

### аб ходзе выкананьня пляну збожжазагатовак па БССР на 25 верасьня

| НАЗВА РАЁНУ | Процант выкананьня галавога пляну |
|---|---|
| Аршанскі | 34,9 |
| Асьвейскі | 36,0 |
| Бабруйскі | 30,1 |
| Бешанковіцкі | 10,4 |
| Віцебскі | 28,1 |
| Вушацкі | 2,3 |
| Гарадоцкі | 16,3 |
| Горацкі | 59,9 |
| Гомельскі | 103,5 |
| Дрысенскі | — |
| Дубровенскі | 34,5 |
| Крупскі | 13,9 |
| Лёзьнянскі | 14,9 |
| Лепельскі | 19,5 |
| Менскі | 18,3 |
| Магілеўскі | 21,5 |
| Мсьціслаўскі | 10,9 |
| Полацкі | 31,5 |
| Расонскі | 38,0 |
| Сеньненскі | 6,9 |
| Сіроцінскі | 10,8 |
| Сураскі | 22,3 |
| Талачынскі | 33,8 |
| Чавускі | 14,2 |
| Чашніцкі | 9,2 |
| Шклоўскі | 32,8 |
| УСЯГО па Белнаапсаюзе: | 24,2 |
| Асіповіцкі | 5,3 |
| Барысаўскі | 15,4 |
| Брагінскі | 15,8 |
| Буда-Кашалёўскі | 28,1 |
| Быхаўскі | 26,8 |
| Бягомльскі | 7,7 |
| Бяльніцкі | 34,7 |

| НАЗВА РАЁНУ | Процант выкананьня галавога пляну |
|---|---|
| Бярэзінскі | 19,3 |
| Веткаўскі | 25,7 |
| Глускі | 17,6 |
| Жлобінскі | 29,4 |
| Жытнавіцкі | 26,5 |
| Заслаўскі | 19,3 |
| Камарынскі | 10,8 |
| Карпілінскі | 21,7 |
| Каралінскі | 1,4 |
| Касьцюковіцкі | 32,7 |
| Клімавіцкі | 28,9 |
| Клічаўскі | 3,6 |
| Койданаўскі | 11,2 |
| Капыльскі | 19,9 |
| Чырвонапольскі | 31,2 |
| Крычаўскі | 22,3 |
| Лагойскі | 21,8 |
| Лельчыцкі | 13,6 |
| Лоеўскі | 27,7 |
| Любаньскі | 7,1 |
| Мазырскі | 21,6 |
| Нараўлянскі | 38,8 |
| Парыцкі | 34,5 |
| Плешчаніцкі | 16,8 |
| Прапойскі | 15,8 |
| Пухавіцкі | 10,0 |
| Пятрыкоўскі | 6,5 |
| Рагачоўскі | 14,2 |
| Рэчыцкі | 19,4 |
| Слуцкі | 16,8 |
| Смалявіцкі | 17,8 |
| Стара-Дарожскі | 12,2 |
| Старобінскі | 27,1 |
| Тураўскі | 6,3 |
| Уваравіцкі | 40,2 |
| Вузьдзенскі | 16,6 |
| Хойніцкі | 33,4 |
| Церахаўскі | 33,6 |
| Чачэрскі | 11,0 |
| Чырвона-Слабодзкі | 18,7 |
| Чэрвеньскі | 4,8 |
| Чэрыкаўскі | 14,0 |
| УСЯГО па Белхлебжывёлсаюзе: | 19,9 |
| УСЯГО ПА БССР: | 20,6 |

## Полаччына павінна падцягнуцца

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

На 25 верасьня галавы плян збожжазагатовак па Полацкім раёне выканан на 17,8 проц. Па цэлым радзе сельсаветаў процант выкананьня яшчэ меншы. Напрыклад, Гарадоцкі сельсавет загатовіў 0,2 проц. пляну, М. Сітнянскі—2 проц., Астроўшчынскі—2 проц., Нацкі—3,6 проц., Васільеўскі, Бабяніцкі, Шпакоўшчынскі, Рудзянскі, Бельскі, Махраўскі, Заскарскі і Дамнікоўскі—ад 5 да 15 проц.

За апошнюю пяцідзеўку па раёне загатоўлена толькі 0,6 проц. галавога пляну, а па цьвёрдых заданьнях паступіла ўсяго... 84 цэнт.

Да першага кастрычніка плян збожжазагатовак павінен быў быць выканан на 50 проц., у найўлясьці-ж поўная бяда дзейнасьць загатоўчых арганізацый, якая паставіла пад рэальную пагрозу выкананьне пляну ў тэрмін.

Рад сельсаветаў ня толькі не спагналі з кулацкіх гаспадарак збожжа па цьвёрдых заданьнях, а нават яшчэ не давёў цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак (Васільеўкі, Мала-Сітнянскі, Гарадоцкі і Астроўшчанскі). Гэтыя сельсаветы не нашукаюць на кулака, а патураюць яго сабатажу.

Перамога ў збожжазагатоўках будзе забясьпечана толькі тады, калі загатоўчыя арганізацыі па-бальшавіцку на-хаду выпраўляць памылкі, адмовяцца ад самацёку і возьмуцца за ўдарную арганізацыю збожжазагатовак.

Анат. Шустры.

Здача збожжа.

## Адстае аднаасобны сэктар

ЖЛОБІН. (Наш кар.).

Гадавы плян збожжазагатовак па Жлобінскім раёне на 25 верасьня выканан на 29,1 проц. Калгасы свой плян выканалі на 57 проц. Адстае аднаасобны сэктар.

Дрэнна выконваюцца цьвёрдыя заданьні. На 25 верасьня ад кулацка-заможных гаспадарак паступіла ўсяго 18 проц. пляну. Слаба таксама паступ збожжа па кантрактацыі—19,5 проц.

На першым месцы па здачы збож па раёне ідзе Чацьвярнянскі сельсав —43,9 проц.

Ганебна адстаюць: Добрагашчынскі 6,1 проц. гадавога пляну, В. Альбін —7,2 проц., Казіміраўскі—8,8 проц., равіцкі—9,2 проц. і інш. сельсаветы.

Машніцк

## 5 калгасаў Талочыншчыны выканалі гадавыя заданьн па здачы збожжа

ТАЛОЧЫН. (БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ»).

КАЛГАСЬНІКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ТАЛОЧЫНСКАГА РАЁНУ АРГАНІЗАВАЛІ Ў ГОНАР ПЛЕНУМУ РАЙВЫКАНКОМУ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ СА ЗБОЖЖАМ. УСЯГО ЗДАНА 570 ЦЭНТ. ЗБОЖЖА.

КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНЫ КРЫЖ», ІМ ЛЕНІНА, ІМЯ КРУПСКАЙ І ІМЯ МА СІМА ГОРКАГА РАПАРТАВАЛІ ПЛ НУМУ АБ СТОПРОЦАНТНЫМ ВЫК НАНЬНІ ЗАДАНЬНЯЎ ПА ЗДАЧ ЗБОЖЖА.

РАЖАНЕЦ, ЧАПЛІНСКІ.



# ГОМЕЛЬ

## паказаў узор барацьбы за фінплян

### ПРЫ АКТЫЎНАЙ ДАПАМОЗЕ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ДАБІЦЦА ПОЎНАГ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

## Ударнікі фінансавага фронту ПРЭМІЯВАНЫ

За пасьпяховае выкананьне кантрольных заданьняў па рэалізацыі пазыкі трэцяга рашаючага, за шырокае разгортваньне вакол гэтай кампаніі ва савай работы, за актыўную працу камісіі садзейнічаньня і грамадзкіх інструктароў, цэнтральная камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчаф справы пры ЦВК БССР прэміявала Віцебскую гарадзкую камісію садзейнічаньня ў суме 1000 руб.

Акрамя гэтага, прэміяваны асабіста старшыня гарадзкой камісіі тав. Каменштэйн і сакратар камісіі тав. Бабіцкі ў разьмеры масячнага акладу пэнсіі.

Адначасова цэнтральная камісія пастанавіла прэміяваць у суме 100 руб. камісію садзейнічаньня калгасу імя Калініна, Чавускага раёну, за 100-проц. ахоп падпіскай па пазыку калгасьнікаў і дапамогу сельсавету ў рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Грабаўскі сельсавет, Церахаўскага раёну, за выкананьне кантрольных ліч баў па рэалізацыі пазыкі прэміюецца 150 рубл.

Ленінскі сельсавет таго-ж раёну за выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі на 80 проц. прэміюецца 100 руб.

Падабранскі сельсавет за выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі на 163 проц. прэміюецца ў суме 200 руб.

Акрамя гэтага, камісія пастанавіла прэміяваць наступных работнікаў фінансава-банкаўскіх установаў:

Тав. Бухмана (Асіпавіцкі раён) за распаўсюджваньне пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва на суму 3000 руб. прэміяваць 80 руб.

Тав. Бацэвіча — разьязнога касіра Чэрвеньскай райашчадкасы за продаж пазыкі па суму 2500 руб. за паўны разьлік прэміяваць 75 руб.

Тав. Красназіра — кантралёра прыпісной касы Клінцоўскага сельсавету за рэалізацыю пазыкі сярод аднаасобнікаў у разьмеры 60 проц. кантрольнай лічбы прэміяваць 75 руб.

Старшыню камісіі садзейнічаньня Грабенскага сельсавету, Чэрвеньскага раёну, і сакратара ячэйкі КП(б)Б гэтага-ж сельсавету пастаноўлена прэміяваць па 50 руб. кожнага за выкананьне кантрольнай лічбы па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

## *Гомель перавыканаў фінплян 3-га кварталу*

### РАПАРТ

ЦК КП(б)Б—тав. Шаранговічу, ЦВК—тав. Чарвякову, СНК—тав. Галадзеду, ЦСПСБ—тав. Рыжову, „Зьвязда"—тав. Будзінскаму, НКФ—т. Абрамсону

ГОМЕЛЬ. (Маланка). Дзякуючы вялікаму энтузіязму рабочых мас і дапамозе шэфагарфа — рабочых заводу імя Ланцуцкага фінплян трэцяга кварталу па Гомелі выканан на 103,5 проц.

Гарком КП(б)Б—Рубін,
Гарсавет—Кандраценка,
Гарпрафсавет—Беленькі,
„Палесская праўда"—Давідовіч

## ПРЫКЛАД ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА —НА ЎСЕ ПРАД ПРЫЕМСТВЫ

### Ліст НКФ СССР да рабочых заводу

НАРКАМФІН САЮЗУ ССР ПАСЛА БЮРО ЯЧЭЙКІ КП(б)Б І ЗАЎКОМУ З ВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА Ў ГОМЕ ЛІСТ НАСТУПНАГА ЗЬМЕСТУ:

«ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! З ГАЗЭТ «ЗЬВЯЗДА» МЫ ДАВЕДАЛІСЯ А ПРАВЕДЗЕНАЙ ВАМІ РАБОЦЕ П ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВУ Ў МАБІЛІЗ ЦЫІ СРОДКАЎ ПА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ.

ЛІЧАЧЫ НЕАБХОДНЫМ АДЗН ЧЫЦЬ ЗАСЛУГІ ПААСОБНЫХ УДА НІКАЎ ВАШАГА ЗАВОДУ, ПРОС ВАС ВЫЯВІЦЬ ГЭТЫХ ТАВАРЫШС І ПРАДСТАВІЦЬ СЬПІС ІХ У НА КАМФІН САЮЗУ ДЛЯ ПРЭМІЯВАН НЯ.

ЗАЦІКАЎЛЕНАСЬЦЬ, ЯКУЮ РАБ ЧЫЯ ВАШАГА ЗАВОДУ ПРАЯВІЛІ А ФІНАНСАВАЙ РАБОТЫ, ПАВІНН БЫЦЬ ЗАМАЦАВАНА І ПАШЫРАН

ЧАС АД ЧАСУ ІНФАРМУЙЦЕ НА АБ ВАШЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ Ў ЎДЗЕЛЕ Ў ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯН

ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ РАБОЧЫ ЗАВОДУ!

З КАМУНІСТЫЧНЫМ ПРЫВІТА НЕМ НАМ. НАРОДНАГА КАМІС РА ФІНАНСАЎ САЮЗУ ССР,

ЛЕВІН.

## Ашчадкаса заводу „Камунар"

### дрэнна мабілізуе сродкі

На заводзе «Камунар» квартальнае заданьне па мабілізацыі сродкаў ня выканана. Рабочая грамадзкасьць не мабілізавана на ліквідацыю прарыву.

Паводле заданьня, ашчадкаса заводу ў трэцім квартале павінна была ўцягнуць фізычных укладаў на 13.000 руб. На справе на 20 верасьня ўцягнута толькі на 5.000 руб. Ашчадкаса да гэтага часу не ўвязала выплату зарплаты з беспаяўнымі разьлікамі.

Агітмасавая работа сярод рабочых аб значэньні ашчадпраны ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў не вядзецца.

Загадчык ашчадкасы тав. Волгін тлумачыць адсутнасьць масавай работы перагружанасьцю апэрацыйнай працай.

П.

*САВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА*

# АГЛЯД РАБОТЫ САВЕТАЎ

## *павінен узмацніць іх масавую працу,*

### *АЖЫВІЦЬ ДЗЕЙНАСЬЦЬ ДЭПУТАЦКІХ ГРУП І СЭКЦЫЙ САВЕТАЎ*

## Перад аглядам работы саветаў

У сувязі з аглядам і справаздачнай кампаніяй саветаў, прэзыдыум ЦВК БССР зьвярнуўся з дырэктыўным лістом да ўсіх райвыканкомаў гарадзкіх і сельскіх саветаў.

— Агляд і справаздачная кампанія павінны быць цесна ўвязаны з усімі палітычна-гаспадарчымі мерапрыемствамі, якія зараз праводзяцца. Праз мабілізацыю грамадзкасьці трэба дабіцца поўнага і датэрміноваага выкананьня ўсіх плянавых заданьняў па загатоўках, мабілізацыі сродкаў і г. д.

Агляд і справаздачная кампанія павінны стымуляваць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і далейшае разгортваньне калектывізацыі, на падставе апошняй пастановы ЦК КП(б)Б аб чарговых задачах калгаснага руху.

Зараз-жа патрэбна шырока разгарнуць падрыхтоўчую работу сярод калгасных мас, бедняко́ў і серадняко́ў-аднаасобнікаў, каб забясьпечыць іх актыўны і самы шырокі ўдзел у аглядзе і ў справаздачных сходах. Павінны быць неадкладна складзены календарныя пляны агляду і справаздачнай кампаніі, аб якіх належыць шырока апавясьціць выбаршчыкаў. Райвыканкомам трэба прымацаваць на ўвесь час кампаніі спайго ўпоўнаважанага да кожнага сельсавету.

Справаздачы саветаў і матар'ялы аглядзу павінны выявіць, як рэалізуюцца паказаньні тав. Сталіна аб новых задачах гаспадарчага будаўніцтва, як выконваюцца наказы выбаршчыкаў. Школы, клюбы, нардамы, хаты-чытальні і іншыя культасьветныя ўстановы павінны неадкладна ўключыцца ў кампанію, прыняць у ёй самы актыўны ўдзел.

Агляд работы саветаў і ход справаздачнай кампаніі павінны быць шырока асьветлены ў масавым друку — раённых і абласных газэтах.

У выніку кампаніі мы павінны дабіцца карэннай перабудовы і шырокага разгортваньня масавай работы гарадзкіх і сельскіх саветаў, у адпаведнасьці з патрабаваньнямі сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

## Вопыт масавай работы

### сэкцый РСІ Буда-Кашалёўскага раёну

Буда-Кашалёўская райКК-РСІ стварыла вакол сябе шырокі добраахвотніцкі актыў, які налічвае 137 чалавек. Пры кожным сельсавеце арганізаваны працаздольныя сэкцыі РСІ, у якія ўцягнуты калгасьнікі, беднякі і настаўнікі. Сэкцыі прымаюць актыўны ўдзел у гаспадарча-палітычных кампаніях, якія зараз праходзяць на вёсцы.

Губіцкая сэкцыя РСІ дабілася поўнага выкананьня сельсаветамі пляну сяўбы ў тэрмін, які вызначан урадам. Сэкцыя наладзіла праверку выкананьня дырэктыў аб сяўбе і ўборцы; абсьледвана дзейнасьць сельспажыўтаварыстваў, у выніку чаго зьнят з работы і аддан пад суд за злоўжываньні прыказчык. Работа сельспажыўтаварыстваў аздароўлена, палепшылася абслугоўваньне калгасьнікаў, што значна ўзьняло аўтарытэт сэкцыі. Ненармальна толькі тое, што сэкцыя свае пастановы ня ўносіць на зацьвярджэньне прэзыдыуму сельсавету, а самастойна праводзіць іх у жыцьцё.

Нагайская сэкцыя РСІ ўцягнула ў сваю работу шырокі актыў. Яна арганізавала групу садзейнасьці пры цагельні імя Варашылава і, выявіўшы там непарадкі і зацяж самакрытыкі, прыняла рашучыя меры да іх ліквідацыі. Абсьледвана работа калгасу «Граніт», старшыня якога Данілаў за злоўжываньні і бескаспадарчасьць зьнят з работы і выключан з партыі. Таксама пры актыўным удзеле сэкцыі выяўлены і ліквідаваны недахопы ў сельспажыўтаварыстве, якое арыгінала забесьпячэньне рабочых і калгасьнікаў і рабіла вялікія накідкі на цэны. Вінаватыя зьняты з работы і аддаены пад суд, які праводзіўся ў паказальным парадку.

Рагінская сэкцыя РСІ, сумесна з сельсаветам, шырока папулярызавала пастанову ЦК КП(б)Б і ўраду аб сканчэньні асеньняй сяўбы да 10 верасьня і дабілася выкананьня гэтай дырэктывы ўсімі калгасамі.

Па раёне ёсьць 13 груп садзейнасьці РСІ з актывам у 78 чалавек, якія таксама ўцягнуты ў работу. Група садзейнасьці ў калгасе «Камінтэрн» выявіла прарывы ў час веснавой сяўбы, пасьля чаго гэтым занялася сэкцыя РСІ.

Дрэнна тое, што Буда-Кашалёўская РКК-РСІ не папулярызуе вопыту работы сэкцый. У раёне няма бюро скаргаў. Невыстарчальна наладжана сувязь з месцамі і інструктаваньне. Некаторыя сельсаветы і сэкцыі РСІ ня ведаюць дакладна ўзаемаадносін паміж сабой. Так, напрыклад, на пленуме Губіцкага сельсавету задавалася пытаньні аб тым, хто каму падпраздкаван—сельсавет сэкцыі, ці сэкцыя сельсавету. Неадпаўнаюча пастаўлен улік працы ў РКК-РСІ, сэкцыях і групах садзейнасьці. Малі ўвагі аддаюць сэкцыі разьмеркаваньню ўрадзкаю і прыбыткаў у калгасах, пастаноўцы зьдзельчыны і ўкараненьню гаспадарчага разрахунку.

У далейшым РКК-РСІ і сэкцыі РСІ пры сельсаветах павінны пераключыцца на ліквідацыю прарываў ва ўсіх галінах работы раёну—па асеньняй сяўбе і ўборцы, сілясаваньні, апрацоўцы ільну, выкананьні фінпляну і загатовак, яшчэ больш папырыць масавую работу.

УЛЕЗЛА.

## Нарада гарсаветаў БССР

НА 20 КАСТРЫЧНІКА ПРЭЗЫДЫУМ ЦВК БССР СКЛІКАЕ ПАПЫРАНУЮ НАРАДУ ПРАДСТАЎНІКОЎ ГАРАДЗКІХ САВЕТАЎ І ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ. НАРАДА ЗАСЛУХАЕ І АБГАВОРЫЦЬ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

1. АБ ПЕРАБУДОВЕ МАСАВАЙ РАБОТЫ ГАРСАВЕТУ, У СУВЯЗІ З НОВЫМІ ЗАДАЧАМІ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ.

2. ДАКЛАДЫ МЕНСКАГА, ГОМЕЛЬСКАГА І ВІЦЕБСКАГА ГАРСАВЕТАЎ АБ ІХ ВОПЫЦЕ МАСАВАЙ РАБОТЫ ЗА ЧАС АД ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ.

## Міжраённая нарада сельсаветаў

Паміж 15 і 25 кастрычніка прэзыдыум ЦВК склікае міжраённыя нарады старшынь сельскіх саветаў.

Нарада сельсаветаў першай групы жывёлагадоўчых раёнаў адбудзецца 15 кастрычніка ў Мозыры; другой групы — 25 кастрычніка ў Менску.

Сельсаветы ільнаводчых раёнаў пасылаюць сваіх прадстаўнікоў на нараду, якая адбудзецца 20 кастрычніка ў Віцебску. Нарада сельсаветаў, раёнаў суцэльнай калектывізацыі адбудзецца 23 кастрычніка ў Менску. Сельсаветы раёнаў, дзе пашырана адыходніцтва, пасылаюць сваіх прадстаўнікоў на нараду, якая назначана на 18 кастрычніка ў Гомелі.

Задача нарад—узмацненьне масавай работы саветаў, распрацоўка мэтадаў і форм работы ў спэцыялізаваных раёнах і раёнах суцэльнай калектывізацыі. На нарадах будуць прысутнічаць, акрамя старшынь сельскіх саветаў—прадстаўнікі райвыканкомаў і члены сельсаветаў—калгасьнікі.

## Наказы выбаршчыкаў ня выкананы

Да агляду і справаздачнай кампаніі саветаў Заскарскі сельсавет, Полацкага раёну, прыходзіць з радам прарываў у палітычна-гаспадарчых кампаніях.

Наказы выбаршчыкаў, даныя ў часе перавыбараў, дагэтуль не падагулены і ня выкананы. Ні на водным пасяджэньні і пленуме сельсавету ня ставілася пытаньне аб выкананьні наказаў.

На тэрыторыі сельсавету ёсьць шмат папсаваных дарог і канаў, праз якія вясной і ўвосень нельга ні прайсьці, ні праехаць. Не хапае мастоў і грэбляў, але аб пабудове і рамонце дарог сельсавет і ня думае.

Амаль усе школы сельсавету прышлі ў нягоднасьць і патрабуюць капітальнага рамонту. Дзьве школы знаходзяцца ў наёмных, напаўразбураных будынках, якія зусім не прыстасаваны для заняткаў з дзецьмі. Сельсавет абсалютна нічога не зрабіў у галіне школьнага будаўніцтва.

Сэкцыі сельсавету: сельска-гаспадарчая, культурная, РСІ і інш., якія былі арганізаваны пасьля перавыбараў, дагэтуль яшчэ не прыступілі да работы і лічацца толькі на паперы. Сельсавет невыстарчальна кіруе арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў.

Хмуры.

## Працуюць бяз мас

Выкананьне палітычна-гаспадарчых кампаній па Бабоўскім сельсавеце, Жлобінскага раёну, праходзіць неадзаль няўча. Плян сілясаваньня кармоў сарваны, разьвіцьцём жывёлагадоўлі сельсавет ня цікавіцца.

Плян асеньняй сяўбы ў вызначаны ўрадам тэрмін выканан толькі на 40 проц. Работа ў калгасах не пераведзена на сацыялістычныя мэтады.

Мабілізацыя сродкаў ідзе надзвычайна марудна. Сельсавет патурае кулацка-заможным гаспадаркам, якія затрымліваюць выплату абавязковых плацяжоў і здачу загатовак усіх відаў. Ня лепш таксама стаіць справа з дарожным будаўніцтвам, загатоўкай і вывазкай лесу.

Гэтыя ганебныя прарывы тлумачацца поўнай адсутнасьцю масавай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў—бедняко́ў і серадняко́ў. Актыў ня ўцягнуты ў работу, сэкцыі бязьдзейнічаюць. Бабоўскаму сельсавету трэба неадкладна разгарнуць масавую работу, мабілізаваць калгасьнікаў, беднякоў і серадняко́ў—аднаасобнікаў на ліквідацыю прарываў.

Калгасьнік.

Год выдання—XV
№ 332 (3174)
Аўторак, 2 лістапада 1931
Цана нумара 5 кап.
БЕСЬПЕРАПЫННА

# Зьвязда

Орган ЦК Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА МЕНСК, СЛЯЦКАЯ, 63.
Тэлефоны
рэдактар—[illegible], 2.)—сакратар—[illegible]
[illegible]

# „Ні пэнса з дапамогі і зарплаты"

## НА ВУЛІЦАХ АНГЕЛЬСКІХ ГАРАДОЎ АДБЫВАЮЦЦА МАГУТНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ РАБОЧЫХ

### ПАЛІЦЫЯ НЯ У СІЛАХ „УТРЫМАЦЬ ПАРАДАК"

ЛЁНДАН, 1. У Манчэстэры адбылася шматлюдная дэманстрацыя беспрацоўных, у якой прынялі ўдзел таксама тысячы рабочых, занятых на вытворчасьці. Дэманстрацыя, у якой у агульным прымала ўдзел звыш 40 тыс. чалавек, праходзіла пад лёзунгамі: «далоў нацыянальны ўрад», «ні пэнса з дапамог і з зарплаты», «вышэй чырвоны сьцяг». Дэманстранты прайшлі па галоўных вуліцах гораду і накіраваліся да будынку муніцыпалітэту. Вулічны рух быў поўнасьцю спынен. Паліцыя аказалася не ў сілах «падтрымаць парадак» на вуліцах. Дэманстрацыя зацягнулася да поўначы.

У Дэрбі адбылася вялізарная дэманстрацыя рабочых пад камуністычнымі пёзунгамі. Дэманстрацыя скончылася шматлюдным мітынгам, на якім была прынята пастанова выставіць на выбарах камуністычнага кандыдата супроць пейбарыста Томаса. З розных канцоў Англіі, асабліва з раёнаў Паўднёвага Уэльса і Ланкашыра, паступаюць паведамленьні аб рабочых сходах, дзе прымаюцца рэзалюцыі, якія асуджаюць лейбарысцкую апазыцыю, у Манчэстэры на радзе сходаў вынесены рэзалюцыі пратэсту супроць прасьледаваньняў «Дэйлі Уоркер». Праведзены зборы сродкаў для падтрыманьня камуністычнай газэты. Зборы праводзяцца на рабочых сходах у розных гарадох. За апошнія дні паступленьні ў фонд «Дэйлі Уоркер» дасягнулі нябывалых разьмераў.

### Агонь, газы і вада супроць дэманстрацый рабочых

#### Паліцыя страляла ў бастуючых гарнякоў

ЛЁНДАН, 30. Як паведамляюць з Канады, у Эстэвоане (правінцыя Саскачван) паліцыя напала на дэманстрацыю бастуючых гарнякоў. Дэманстрацыя праходзіла пад рэвалюцыйнымі лёзунгамі. Рабочыя несьлі вялікі плякат, на якім быў намалёван серп і молат. Паліцыя патрабавала, каб дэманстранты разышліся. Аднак, рабочыя ўсё-ж рухаліся ўперад. Тады паліцыя пачала страляць у паветра. Гарнякі, аднак, працягвалі дэманстраваць. Спроба разагнаць дэманстрантаў пры дапамозе пажарных брандбоў таксама ня мела посьпеху. Потым былі пушчаны ў ход сьлёзатачывыя газы. І гэта мера не дала рэзультату. Тады паліцыя адкрыла агонь — забіла двух і параніла 25 чалавек. Раён абвешчан на стане аблогі. Выкліканы новыя падмацаваньні. Настрой рабочых баявы. Забастоўка гарнякоў, якія змагаюцца за павышэньне зарплаты, пракодзіць пад кіраўніцтвам камуністаў.

### Нармальнае жыцьцё гораду было спынена

ЛЁНДАН, 1. Дэманстрацыя рабочых, якая адбылася ў Манчэстэры, прадстаўляла відовішча, ніколі нябачанае раней, нават у часе ўсеагульнай забастоўкі. Каля зборнага пункту, вызначанага кампартыяй, сабралося 20 тыс. беспрацоўных, якія накіраваліся да памяшканьня раённага кантралёра па пытаньнях працы. Па дарозе да дэманстрацыі далучыліся новыя калёны і ў цэнтры гораду агульная маса дэманстрантаў складала ўжо ня менш 40 тыс., а праз паўгадзіны каля памяшканьня кантралёра па пытаньнях працы, у дэманстрацыі прыняло ўдзел 50 тыс. рабочых.

Ня гледзячы на тое, што ўваход у памяшканьне кантралёра загарадзіла паліцэйская варта, дэлегацыя, выбраная ад дэманстрацыі ўварвалася у памяшканьне і прад'явіла кантралёру пэтыцыю ад імя дзесяткаў тысяч беспрацоўных з патрабаваньнем недапушчэньня урэзак дапамог. У пэтыцыі катэгарычна заяўляецца, што «манчэстэрскія рабочыя ў супрацоўніцтве з беспрацоўнымі ўсёй Вялікабрытаніі будуць змагацца супроць урэзак дапамог да тых пор, пакуль не перамогуць». Кантралёр прабаваў было адмовіцца ад прыняцьця пэтыцыі, аднак, бачачы настрой дэлегацыі, вымушан быў заявіць, што ён накіруе пэтыцыю ўраду. Пасьля перагавораў дэлегацыі з кантралёрам адбыўся бурны мітынг, пасьля скончэньні якога дэманстрацыя зноў прайшла па галоўных вуліцах гораду.

Баючыся супраціўленьня з боку рабочых, паліцыя не прабавала перашкаджаць дэманстрацыі і калёны прайшлі бяз сутычак з паліцыяй, але ўсё нармальнае жыцьцё гораду і рух па вуліцах былі спынены.

### Блізка 3.000.000 беспрацоўных у Англіі

ЛЁНДАН, 1. ПАВОДЛЕ АФІЦЫЯЛЬНЫХ ДАНЫХ, ЛІК ЗАРЭГІСТРАВАНЫХ БЕСПРАЦОЎНЫХ, ШТО АТРЫМЛІВАЮЦЬ ДАПАМОГУ, У АНГЛІІ НА 21 ВЕРАСЬНЯ СКЛАДАЎ 2.812 ТЫС. ЧАЛАВЕК — НА 23.535 БОЛЬШ, ЧЫМ ТЫДЗЕНЬ НАЗАД І НА 702 ТЫС. БОЛЬШ, ЧЫМ У ТОЙ-ЖА ПЭРЫЯД МІНУЛАГА ГОДУ.

### Капіталісты парушаюць калдагавары

БЭРЛІН, 30. З мэтай зьніжэньня зарплаты, нямецкія прадпрыемцы праводзяць кампанію парушэньня калдагавароў. Калдагавары парушаюцца ў вугальнай, металюргічнай, хэмічнай, тэкстыльнай прамысловасьці, а таксама на прадпрыемствах транспарту. Парушэньне дагавароў, якія рэгулююць зарплату на чыгунках, закранаюць інтарэсы паўмільёна рабочых. Парушан таксама дагавор з рабочымі, занятымі на дзяржаўных ваенных верфях.

# ЖЭРЛЫ ЯПОНСКІХ ГАРМАТ

## накіраваны на гарады ўнутранога Кітая

### КІТАЙСКІЯ МІЛІТАРЫСТЫ І ГАМІНДАН НА КАЛЕНЯХ ПЕРАД АКУПАНТАМІ

### 23 японскіх браняносцы ў кітайскіх водах

ШАНХАЙ, 1. Безвытрыманьня ў Шанхаі японскі крэйсэр «Цусіма» прайшоў у напрамку да Нанкіна. З часу акупацыі з Манчжурыі больш 23-х японскіх ваенных суднаў прыбыло ў кітайскія воды і чакаецца прыход новых.

### Японскія мэрані гаспадароць у Шанхаі

ШАНХАЙ, 30. Спробы канфіскаваць японскія тавары, прадпрынятыя пікетамі анты-японскай асацыяцыі ў Шанхаі былі зьведзены на нішто асобнымі камандамі і ўзброенымі атрадамі японскіх мэранаў, якія з кулямётамі і вінтоўкамі пайшлі ў кітайскі горад, разганяючы пікеты.

### Тэлеграфная сувязь зьнішчана салдатамі

БЭЙПІН, 30. Цяньцзінскія газэты паведамляюць, што японскія салдаты закрылі тэлеграф Бэйпін—Мукдэнскай чыгункі ў Хуангдуне, спыніўшы тым самым тэлеграфную сувязь паміж Бэйпінам і Мукдэнам.

### Чан-Сюэ-Лян пачынае перагаворы з Японіяй

ТОКІО, 30. Агэнцтва Сімбун Рэнго паведамляе: «Манчжурскія ўлады ў Мукдэне парашылі пачаць непасрэдныя перагаворы з Японіяй аб урэгуляваньні япона-кітайскіх пытаньняў, зьвязаных з манчжурскімі падзеямі». Адначасова ўсе газэты ў Бэйпіне заявляюць, што Чжан Сюэ-лян парашыў пачаць перагаворы з Японіяй.

### Катаржны прысуд над рабочымі ў Варшаве

ВАРШАВА, 30. Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік» ад 29 верасьня, перад Варшаўскім акруговым судом адбываўся працэс 14 рабочых-пекароў. Падсудных абвінавачвалі ў тым, што яны прымалі ўдзел у разгроме 3 пякарань, у якіх ужывалася звышнормавая праца. Трэба ўзяць пад увагу, што польскія капіталісты, ня гледзячы на вялізарныя разьмеры беспрацоўя і надалей імкнуцца працягнуць рабочы дзень, прымушаючы рабочых працаваць звыш нормы. У пякарнях рабочы дзень, як правіла, раўняецца 10 гадзінам і больш.

Працэс пекароў працягваўся 5 дзён. 28 верасьня быў вынесен прыгавор. Засуджаны: ГУТЭРМАН на 5 год катаргі, БЛЮМКІН — на 2½ гады, КАМЯНКОЎСКІ, СУПЭ, ЛЯЎКОВІЧ, ЦЫГЕЛЬМАН і ПЯТАК — на 1½ гады кожны, ВОЛЬФ і ШМІГЕЛЬ на 1 год, ВІШНЕЎСКІ І КЛІЯЙМАН на 6 месяцаў турмы.

### Выступленьні супроць акупантаў у Заходняй Беларусі ня спыняюцца

ВАРШАВА, 30. Барацьба з фашысцкімі ўладамі на акупаванай Заходняй Беларусі з кожным днём абвастраецца. Як адна з праяў гэтай барацьбы, што раз часьцей пачынаюць паўтарацца выпадкі «антыдзяржаўнага» сабатажу: падпалы памешчыцкіх маёнткаў, напады на паліцыю і шпікоў, замахі на цягнікі і г. д.

«Газэта Варшаўска» і «Роботнік» ад 29 верасьня прыносяць весткі аб новым акце сабатажу ў Заходняй Беларусі.

На чыгуначным шляху Вільня-Глыбокае недалёка ад станцыі Лынтупа былі разьвінчаны рэйкі. Пасажырскі цягнік, які ў гэты час надыходзіў, саскочыў з рэек. Толькі дзякуючы таму, што ход цягніка быў ужо значна прыцішан, замах ня меў катастрафічных вынікаў.

Зараз-жа на месца катастрофы выехала спэцыяльная следчая камісія. Сьвяцянскі павятовы стараста, і, зразумела, цэлы рой яўнай і тайнай паліцыі. Сярод вакалічнага сялянства праведзены шматлікія арышты.

## Новыя перамогі пяцігодкі

### Пушчан у ход ёдны завод

Уступіў у строй ёдны завод у Сураханах, магутнасьцю ў 20 тон ёду. Магутнасьць ёднага заводу—«Нэфтэ-Чале» да канца году будзе даведзена да 100 тон. Азэрбайджан зьяўляецца асноўным месцанараджэньнем ёду і да канца пяцігодкі будзе даваць 500 тон ёду. Агульныя патрэбы Саюзу ў ёдзе складаюць каля 200 тон.

### Новыя прадпрыемствы і цэхі ў Ленінградзе і Ленінградзкай вобласьці

У Ленінградзе і Ленінградзкай вобласьці заканчваецца пабудова 40 новых прадпрыемстваў і цэхаў. Гаўскі хімічны камбінат, які будзе перапрацоўваць хібінскія апатыты, гатоў на 95 проц. Магутная электрастанцыя Ленінграда—другая «ГЭС»—у асноўным ужо скончана. У хуткім часе ўступіць у строй новая мэханічная майстэрня Ікорскага заводу. На гэтым-жа заводзе заканчваецца пабудова новага сталёпа-пязьвільнага цэху. Першая чарга электрамеханічнага камбінату на Звянку гатова на 75 проц.

### Выраб водных трамваяў

«Союзверф» арганізуе ў Ленінградзе выраб дрэўляных і сталёвых водных трамваяў, якія будуць курсаваць па Няве і каналах. У дрэўляным водным трамваі можа зьмясьціцца каля 35 чалавек, а ў сталёвым—каля 100 чал. Хуткасьць—22 кілёмэтры ў гадзіну.

Першыя два вопытных дрэўляных трамваі будуць выпушчаны да 14-й гадавіны Кастрычніка.

### Тры новых маслазаводы

У будучым годзе плошча масьлічных культур у Сярэдня-Волскім краі даводзіцца да 984 тысяч гэкт. супроць 673 тысяч гэкт. у гэтым годзе. У сувязі з такім пашырэньнем плошчы масьлічных культур у краі будзе пабудавана 3 вялікіх маслазаводы.

### Пабудаваць новы кансэрвовы завод

У Астрахані за 5 з пал. месяцаў пабудован і змантураваны кансэрвовы завод, пяты на ліку цэх Астрахаўскага рыбакансэрвовага камбінату імя т. Мікаяна. 1-га кастрычніка было скончана будаўніцтва ўсіх вытворчых цэхаў першага гіганту сацыялістычнай рыбнай прамысловасьці.

### Выстаўка-конкурс

#### нізавога фабрычна-заводзкага друку—удзельнікаў манэўраў

Менгарком КП(б)Б, рэдакцыя газэты «Рабселькор», гарсавет Асоавіяхіму і гарпрафсавет наладжваюць 5 верасьня ў доме Камасьветы выстаўку-конкурс ні завода фабрычна-заводзкага друку па пытаньні ўдзелу шматтыражак, насьцен газэт і штодзённік у манэўрах РСЧА і СНА.

Лепшыя газэты і іх рэдактары будуць прэміраваны.

Прапануецца рэдкалегіям фабрычна-заводзкіх газэт па практычных пытаньнях выстаўкі зьвязацца з загадчыкам кабінэту журналістыкі пры доме Камасьветы—тав. Левіным.

### Назначэньні

— Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанавіў назначыць СТАРШЫНЯЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПЛЯНАВАЙ КАМІСІІ пры СНК БССР тав. ШАПІРА Зьмітра Мікалаевіча і надаць тав. Шапіра права рашаючага голасу ў СНК.

— Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў ослабаніць тав. БУНІКА, у сувязі з яго пераходам на іншую работу, ад абавязкаў намсэньніка НКФ БССР.

Грамадзкае харчаваньне

# ЗАКРЫЦЬ ШЛЯХ НЯДОБРАЯКАСНЫМ АБЕДАМ

## Сталоўні жанту № 6 у Менску і ў Вушачах паказваюць прыклады ўмелай работы

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове аб мерах паляпшэньня грамадзкага харчаваньня канстатавалі, што пералому ў гэтай справе няма. Становішча грамадзкага харчаваньня не адавальняе росту запатрабаваньняў рабочых мас.

Аб тым, што гэта так, сьведчаць шмат лікія карэспандэнцыі з месц. Рабселькоры ў сваіх лістах сыгналізуюць, што пастанова ЦК УсеКП(б) і кіруючых партыйных і прафэсыянальных арганізацый БССР аб грамадзкім харчаваньні не знайшлі належнага адбітку ў рабоце сэкцый грамадзкага харчаваньня і сталовак.

У рабочай сталоўцы пры фабрыцы «Днепроўская мануфактура», — як паведамляе нам рабкор Т. — абеды зусім дрэнныя. Адміністрацыя сталоўкі не пакланацілася аб тым, каб забясьпечыць сталоўку гародзінай. Такое-ж становішча і ў гарадзкіх сталоўках. Член праўленьня Спажыўтаварыства, ён-жа загадчык аддзелу забесьпячэньня, на нарадзе заявіў: — «закупаць гародніну — камэрцыйна няматэзгодна».

Тав. Неўскі паведамляе з Віцебску, што на многіх суднах дагэтуль не арганізаваны сталоўкі. Водніцкая канфэрацыя гэтым пытаньнем ня цікавіцца. Для паляпшэньня работы на час асенніх перавозак тав. Неўскі прапануе, каб на буйных прыстанях былі адкрыты ларкі з прадуктамі харчаваньня і каб яны працавалі крутныя суткі.

Зусім злачынна адносяцца працаўнікі Менскага ЦРК да абслугоўваньня студэнтаў БДУ і Вышэйшага Пэдінстытуту, якія прымацаваны да сталоўкі № 1. Сэкцыя грамадзкага харчаваньня ЦРК ня ўлічыла таго, што гэта сталоўка знаходзіцца на вялікай аддалёнасьці ад Універсытэцкага гарадку і мае вельмі вялікую нагрузку. Сталоўка ня можа прыстасавацца да ўмоў работы студэнцтва. Бываюць выпадкі — піша тав. Я. Гафт, — калі студэнты застаюцца без абеду. 22-га верасьня прышлося чакаць цэлую гадзіну, каб атрымаць адказ: «Дарэмна чакаеце, абеду ўжо няма».

Аб гэтым-жа піша група студэнтаў. Яны скарджацца на тое, што з-за дрэннай працы сталоўкі прыходзіцца марна траціць час, што выклікае пропускі і спазьненьні на заняткі. Студэнты патрабуюць палажыць канец гэтым непаладкам.

Ня лепш і ў сталоўцы жанту № 1. Як паведамляе тав. Мазалеўскі, сталоўка знаходзіцца ў антысанітарным становішчы. У кладоўны, дзе захоўваюцца прадукты — брудна і вільготна.

Праўда, ёсьць рад сталовак, якія пасапраўднаму прыступілі да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня. Напрыклад, сталоўка жанту № 6 перайшла на гаспадарчы разрахунак, мае свой агарод, 11 кароў, 6 сьвіней. Пастанова партыі і ўраду давадзена да кожнага рабочага сталоўкі. Заключан сацдагавор са сталоўкай жанту № 5 і г. д.

З м. Вушачы тав. Ліпаўка піша, што на працэсу доўгага часу грамадзкае харчаваньне было пастаўлена дрэнна, тамму, што загадчык сталоўкі Варабейчык (былы гандляр) гэтай справай ня цікавіўся.

Новы загадчык тав. Сьмушкін карэнным чынам перабудаваў усю работу сталоўкі. Зьнішчана абязьлічка, правільна расстаўлена рабочая сіла. Значна палепшылася санітарнае становішча сталоўкі. Уведзена абанімэнтная сыстэма, зьнішчана чарга і г. д.

Такім чынам, там, дзе работнікі грамадзкага харчаваньня пры дапамозе пралетарскай грамадзкасьці па-бальшавіцку ўзяліся за перабудову работы, дасягнуты значныя посьпехі.

ЦК і СНК у сваёй пастанове далі выразныя дырэктывы ў справе хутчэйшай перабудовы грамадзкага харчаваньня.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі навінны безадкладна прыступіць да практычнай рэалізацыі гэтых дырэктыў.

Клюб Саўгандальслужачых
Бел. Дзярж. Вандроўны тэатр пад кір. нар. артыста ГАЛУБКА
3-га кастрычніка ВІХОР
у 4-х актах, Сташэўскага
Пачатак у 9 г. Білеты ў раб. касе

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Першы гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё, драма ў 34 эпізодах.
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы мастацкі фільм РАЗГРОМ
ПРАЛЕТАРЫ Дзнр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм: ГАРАДЫ І ГАДЫ, Пачатак сэансу у 2 гад. дня.
Інтэрнацыянал Адкрыт з 12 г. дня — Бунт бабулек, Звыш. праграм. хроніка № 31
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ДЖЫМІ ХІГГІНС у 8 частках, Звыш праграмы—хроніка. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 5 г. — З 1-га кастрычніка—баявік РЭЙНСКІ БУНТАР, драма ў 7 частках.

БЕЛДЗЯРЖСНАБЗБЫТУ ПАТРЭБЕН на стałую працу ЮРЫСКОНСУЛЬТ.
Адрас: Белдзяржснабзбыт, Дом Камунбанку, Ленінская, 35, тэлефон № 4-53.

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
100.000 ГЛЯДАЧОЎ да 5 кастрычніка
ПАВІННЫ ПРАГЛЕДЗІЦЬ КАРЦІНУ „Пуцёўка ў жыцьцё"
Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА ПРАДАЕ
праз свае філіялы ў Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, Бабруйску, Оршы, Полацку і Мазыры
МНОЖАЛЬНЫЯ АПАРАТЫ
ШКЛОГРАФЫ, РАТАТАРЫ і розныя прыклады да іх.

МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову, шукае месца.
Зварачацца пісьмова па адрасе: Новы-Маскоўская, 1, кв. 11, Вікснан.

Згублен пашпарт на імя ТАРАСЭВІЧ Е. І., выд. Менскі міліцыяй. Лічыць несапраўдным.

УВАГА!
Скора выходзіць з друку першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі ВСНГ і ЦПСБ
„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" разьлічана на шырокія колы кадэндзкага складу прамысловасьці, партыйна-камсамольскага і прафэсыйнага актыву, кваліфікаваных рабочых-вынаходнікаў, ударнікоў.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня тэхнікі сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.
Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" мае аддзелы: 1) Агульны; 2) Арганізацыя вытворчасьці; 3) Дасягненьні навукі і тэхнікі ў СССР і за мяжой; 4) Абмен вопытам; 5) Кадры і рабсіла; 6) На месцах; 7) Хроніка; 8) Сярод кнігак; 9) Адказы і кансультацыя.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на год—3 р., на 6 м-цаў—1 р. 60 к., на 3 м.—85 к. Кошт паасобнага нумару—30 кап.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Пляц Волі № 21-1, ВСНГБ, 2-гі паверх, пакой № 6. Тэлефон № 14-33.
За выхадам нумару сачыце ў газэтах.
Падпіска прымаецца толькі праз пошту і пашчовыя агенцтвы.

Кошт публікацыі аб згубе дакуманту 1 руб.

Вынікі манэўраў часьцей БВА

# УПЕРАД,

## да новых вышынь баявой падрыхтоўкі!

### ЗАКЛЮЧНЫ РАЗБОР МАНЭЎРАЎ, ЗРОБЛЕНЫ КАМАНДУЮЧЫМ ВОЙСКАМІ БВА тав. УБАРЭВІЧАМ

### АГУЛЬНЫЯ ВЫНІКІ

Працяжныя манэўры БВА у лясістабалоцістай мясцовасьці, з дрэннымі дарогамі і пры амаль бесьперапынных дажджох, прад'явілі войскам вялікія запатрабаваньні ў сэнсе стойкасьці і захаваньня пры гэтых умовах баявой сьвежасьці і арганізаванасьці.

Вынікі баявых дзеяньняў на манэўрах сапраўды паказалі, што стойкасьць войска заслугоўвае зусім здавальняючай ацэнкі. Усюды пасьля вялікіх пераходаў над дажджом, ня маючы магчымасьці адагрэцца, з прычыны невыстарчальнай колькасьці населеных пунктаў, войскі ня трацілі бадзёрасьці і наступальных імкненьняў.

Некаторыя баявыя дзеяньні цягнуліся бесьперапынна 60 гадзін, байцы былі амаль бяз сну і адпачынку. І пры гэтых умовах войскі давалі ўзоры выключнай энэргіі і моцнага баявога імпэту. Процант эвакуяваных і хворых за ўвесь час манэўраў аказаўся малы, што таксама сьведчыць аб вялізарнай стойкасьці, асабліва Н-скага корпусу, кавалерыі і авіяцыйных частак.

Другой асаблівасьцю манэўраў—было дабіцца ў баявых дзеяньнях умоў, блізкіх да ўмоў сапраўднай вайны, не дапускаць тышавых «баталій» мірнага часу, навучыць войска лічыцца днём і ноччу з узрослай магутнасьцю сучаснага кулямётнага, артылерыйскага агня і дзеяньнямі авіяцыі. Як вывад, у выніку манэўраў можна адзначыць, што дзеяньні войск і камандваньня з гэтага пункту гледжаньня былі правільнымі, за рэдкімі выключэньнямі.

Наступнай характэрнай рысай манэўраў зьяўляецца якасьць кіраўніцтва ўсіх ступеняй. І тут можна сказаць, што кіраўніцтва карпусамі, дывізіямі, палкамі і ніжэйшымі падразьдзяленьнямі было бязумоўна спакойным, упэўненым і давокі вопытным у вайсковых адносінах, зноў-такі за рэдкімі выключэньнямі.

На жаль, штабы яшчэ не пасьпелі ў выстарчальнай ступені забясьпечыць работу камандваньня, асабліва пры ўмовах, якія хутка мяняюцца. Трэба адзначыць, што гэты год напружанай камандзірскай і штабной вучобы значна адбіўся на ўзьняцьці якасьці работы начскладу ва ўсіх адносінах. У выніку манэўраў мы маем падставу канстатаваць, што большасьць важнейшых паказаньняў па баявой падрыхтоўцы народнага камісара тав. Варашылава выканана, а даўгі, якія засталіся за вайсковымі часьцямі будуць зараз-жа ліквідаваны.

У далейшым камандуючы адзначае падрабязна ў якіх баявых дзеяньнях, якія вайсковыя часьці паказалі лепшую падрыхтаванасьць і якія часьці нізінны ў хуткім часе зьнішчыць недахопы. Асабліва адзначыў камандуючы войскамі напружанасьць манэўраў, мноства выключна цікавых баявых эпізодаў. Наяўнасьць вялікай колькасьці дасканала праведзеных баявых апэрацый залежала ў першую чаргу ад вялізарнай зацікаўленасьці, з якой адносіліся да справы чырвоаармейскія масы.

Першая наша падзяка адносіцца да нашых храбрых байцоў, якія праявілі максымум адданасьці справе, зацікаўленасьці і любві да вайсковай службы. Вытрыманасьць і дысцыпліна былі бязумоўна на належнай вышыні.

### Ацэнка дзеяньняў асобных радоў войска

ПЯХОТА. Якасьць пяхоты ў часе манэўраў можна ацаніць як зусім здавальняючую. Асабліва трэба адзначыць выразную маршавую дысцыпліну, стойкасьць і хуткасьць пры праходжаньні маршаў у цяжкіх умовах, выключную ініцыятыву і актыўнасьць пры начных дзеяньнях, сьмеласьць у перамаганьні водных перагарадаў. Былі выпадкі, калі цэлыя батальёны пасьля працяжных баёў кідаліся ў ваду на пояс і вышэй для атакі «праціўніка». Самаакопваньне пяхоты таксама было здавальняючае. Манэўраваньне баявога парадку, узаемадзеяньні агня з рухам зьяўляецца бязумоўна ўжо прапрацаванымі. У далейшым неабходна зьвярнуць увагу на лепшую апрацоўку атакі. Неабходна яшчэ большае маскаваньне пяхоты ад авіяцыі.

Пры ўзаемадзеяньнях з танкамі, пры прарыве абарончай паласы праціўніка неабходна раіць больш цесную ўвязку асобных груп байцоў з танкамі, каб паказаць танкам флянгавыя ці маскаваныя кулямёты праціўніка.

Асабліва трэба адзначыць як вялікае дасягненьне, гэта цесную сувязь баявой работы пяхоты з артылерыяй ва ўсіх відах бою.

У заключэньне трэба сказаць, што па падставе манэўраў кожны ўдзельнік вынес уражаньне аб узросшай рухомасьці, вялікім баявым вопыце пяхоты, аб яе ўменьні карыстацца сродкамі сучаснага агня.

АРТЫЛЕРЫЯ. Работа артылерыі па манэўрах была ў цэнтры ўвагі і па яе долю пярэдка выпадала асноўнае вырашэньне задач. Значная частка баявых дзеяньняў прадстаўляла сабою барацьбу супроць абарончых межаў праціўніка, калі роля артылерыі асабліва ўзрастала.

Работа батальённай і палкавой артылерыі праходзіла ў даволі цеснай сувязі з патрабаваньнямі пяхоты і ў большасьці выпадкаў пяхоце ня прыходзілася чакаць пакуль разьвернецца артылерыя. А гэта ў сучасным бае —галоўнае.

Умовы лясістай мясцовасьці і цяжкое для працы авіяцыі надвор'е натуральна пагоршвалі работу артылерыі. Але тут мы маем у цэлым радзе выпадкаў зусім здавальняючыя вынікі. Умовы мясцовасьці і надзвычайна цяжкія дарогі і ў дадатак разьбітыя вялікай колькасьцю праходзіўшых частак, прадстаўлялі для артылерыі вялікія цяжкасьці пры хуткай зьмене пазыцый і патрабавалі выключнай стойкасьці конскага складу.

КОНЬНІЦА. Коньніца, як і трэба было чакаць, паказала на манэўрах вялікую рухомасьць, здольнасьць хутка перагрупоўваць свае сілы. На зьмесьце манэўраў на долю коньніцы, галоўным чынам, выпалі цяжкія абарончыя баі супроць сіл пяхоты, якія ў некалькі раз перавышалі яе сілы, што патрабавала ад коньніцы ўмела выкарыстаньня сваіх багатых адзнакавых сродкаў і хуткага манэўраваньня на кані.

Двухтыднёвыя баі кавдывізіі, праўда, падтрыманай значнымі сіламі авіяцыі супроць пераважаючых сіл «праціўніка», далі выканьне вялікай апэрацыйнай задачы і паказалі вялікае ўпорства ў абароне і рашучасьць кавалерыйскіх начальнікаў.

У заключным этапе манэўраў кавалерыя прымала ўдзел у цяжкі момант для баявога вучастку—у ліквідацыі прарыву—і зрабіла надзвычай моцныя конныя атакі, якія могуць мець значны посьпех, будучы падтрыманымі сучаснымі танкамі. Маскаваньне коньніцы супроць работы авіяцыі зьяўляецца сёньня вельмі цяжкой задачай і, натуральна патрабуе яшчэ ўпартай далейшай работы.

АВІЯЦЫЯ. Работа авіяцыі на манэўрах гэтага году была аддана асаблівая ўвага ўсіх удзельнікаў. У вельмі цяжкіх умовах, у важнейшых фазах «баёў» цэлыя эскадрыльлі самалётаў прымалі ўдзел, і з вялікім посьпехам. Асабліва радасна адзначыць уменьне авіяцыі канцэнтраваць свае сілы на важнейшым аб'екце і энэргічнымі паўторнымі масавымі дзеяньнямі дабівацца посьпеху.

Узаемадзеяньні авіяцыі і артылерыі, з наземнымі вайскамі, разьведвальнай службай—праводзіліся здавальняюча.

Калі яшчэ раз успомніць аб выключна цяжкіх атмасфэрных умовах, дык вынікі дзейнасьці авіяцыі на манэўрах трэба прызнаць цалкам добрымі, і ўсё войска вельмі ўдзячна нашаму лётаму складу за яго ўдалую і самаадданую работу.

ТАНКІ і іншае тэхнічнае войска пасьмеры магчымасьці прымала ўдзел у адпаведных баявых дзеяньнях і паказала бязумоўны рост баявой падрыхтоўкі.

Вось кароткі пералік вываданьняў, якія паказалі манэўры гэтага году. Да ўсяго сказанага трэба дадаць радасную карціну ўважлівых адносін мясцовага насельніцтва да ўсіх баявых дзеяньняў чырвоаармейскіх часьцей.

Часьці БВА, з посьпехам завяршыўшы манэўры, возьмуцца з яшчэ большай сілай і энэргіяй за далейшую вучобу, за ліквідацыю недахопаў і ўзьняцьце сваёй баявой падрыхтоўкі, асабліва ў пытаньнях ужываньня сучаснай тэхнікі і паляпшэньня мэтадаў кіраўніцтва вайсковымі злучэньнямі. (БЕЛТА).

# КОЖНЫ СКЛАД—У НЕВЯЛІКІ ЭЛЕВАТАР!

## Вопыт мэханізацыі Менскага цэнтральнага складу — ва ўсе збожжавыя склады БССР!

Мэханізацыя пагрузачна-разгрузачных работ на складах Саюзхлеба—адна з актуальнейшых задач сёньняшняга дня. Старыя мэтады пагрузкі і выгрузкі збожжа аджылі свой век,—ударныя тэмпы збожжазагатовак патрабуюць і ўдарнай, хуткай, бесьперабойнай работы збожжавых складаў.

У напрэмку мэханізацыі разгрузачных работ, МЕНСКІ ЦЭНТРАЛЬНЫ СКЛАД ужо дабіўся вялікіх посьпехаў. Работнік складу т. ЛЯНДРЭС распрацоўвае праект мэханізацыі складу, які паўнасьцю ўхвален Саюзхлебам і зараз ажыцьцяўляецца.

Працэс мэханізацыі зводзіцца да наступнага. Вагоны, нагружаныя збожжам, падаюцца па чыгуначнай лініі да прыёмнай ямы (можна таксама пад'язджаць і на фурманках). Разгрузку вагонаў робяць 1-2 рабочых рыдлёўкамі. Збожжа падаецца ў яму праз шчыт. Потым з ямы збожжа чэрпаецца норыямі (каўшамі) па саматасачнай істужцы (элеватар), адкуль яно па жолабу трапляе ў склад на гарызантальны транспарцёр з разьмеркавальнай цялежкай. Пры дапамозе апошняй збожжа затрымліваецца ў любым месцы складу і насыпаецца на любы пласт. Транспарцёр і саматасачныя істужкі зроблены з пяньку. Усё абсталяваньне на 90 проц.—з дрэва. Саматаску і транспарцёр абслугоўваюць тры электраматоры.

Разгрузка збожжа ў яму разьлічана на два вагоны адначасова (16 вагонаў за зьмену). Апрача разгрузкі непасрэдна праз яму будуць яшчэ пастаўлены тры нахіленыя транспарцёры ля дзьвярэй складу, што дасьць магчымасьць адначасова разгружаць яшчэ 3 вагоны. За 8 гадзін мэжна будзе такім чынам разгрузіць 40 вагонаў збожжа.

Нахіленыя транспарцёры будуць пабудаваны таксама з дрэва. Гэта дае вялікую эканомію. Кошт жалезнага транспарцёра 2.400 р., дрэўляны-ж будзе каштаваць ня больш 800 руб.

Работы па мэханізацыі складу ў асноўным ўжо закончаны. СКЛАД НАБЫВАЕ ВЫГЛЯД НЕВЯЛІЧКАГА ЭЛЕВАТАРА. Пад дахам складу, не закранаючы кубатуры засекаў, працягнуўся 100-мэтравы памост, дзе, нагружаны збожжам, будзе рухацца гарызантальны транспарцёр.

Зараз т. Ляндрэс распрацоўвае праект МЭХАНІЗАЦЫІ ПАДАЧЫ СЫРОГА ЗБОЖЖА Ў СУШЫЛКУ І СУХОГА Ў ХАЛАДЗІЛЬНІК. Гэта мерапрыемства дасьць эканомію рабочай сілы да 70 проц., а самае галоўнае, ня будзе ніякай патрэбы ў карыстаньні тарай пры перасыпцы збожжа.

Сродкі, затрачаныя на мэханізацыю складу, акупаюцца на працягу 2-3 месяцаў. Праект тав. Ляндрэса, які пасьпяхова зараз ажыцьцяўляецца на менскім цэнтральным складзе Саюзхлеба, дасьць тысячы рублёў эканоміі і забясьпечыць выразную бесьперабойную работу складу. ГЭТЫ ВОПЫТ ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ПЕРАНЕСЬЦІ ВА ЎСЕ БОЛЬШ БУЙНЫЯ ЗБОЖЖАВЫЯ СКЛАДЫ БССР.

В. К.

## Паведамленьні

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Віцебску 5-Х і 6-Х-31 г. будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам члена ПК ЦКК т. Блюмтэйна па разглядзе апэляцый. На ПТ павінны зьявіцца:

на 5-Х-31 г.: Зарэцкі В. В., Краўло Ф